ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок непр. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідкі. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбаўкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў галоўнай канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

СУБОТА, 15 лютага 1930 г.
№ 38 (3546)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Усе на барацьбу са стратамі ў вытворчасьці

Да рабочых, работніц і ўсіх працоўных БССР

Нашы выключныя посьпехі на фронце гаспадарчага будаўніцтва, вялізарны творчы энтузіязм мас, які выяўляецца ў новых, камуністычных формах адносін да працы (сацыялістычнае спаборніцтва, ударныя брыгады, бесьперапынная праца), паскараюць тэмп індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Далейшае ўзмацненьне дасягнутых посьпехаў на шляху выкананьня вялікіх работ пяцігодкі ў больш скарочаны тэрмін — за чатыры-тры гады — патрабуе вялізарнага напружаньня сіл, поўнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і самага строгага рэжыму эканоміі ва ўсіх галінах вытворчасьці і кіраўніцтва. Вось чаму перад намі ва ўсёй вострасьці стаіць задача барацьбы са стратамі ў нашай гаспадарцы, барацьбы з няпоўным скарыстаньнем магчымасьцяй паскарэньня тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Нерацыянальнае скарыстаньне сырцу, матар'ялаў, машын, рабочага часу, прастоі на прадпрыемствах, ужываньне ў вытворчасьці дарагіх і дэфіцытных матар'ялаў там, дзе яны могуць быць заменены больш таннымі і недэфіцытнымі — у выніку ўсяго гэтага мы маем мільённыя страты.

Таксама ствараюцца вялікія страты ад нескарыстанага браку, адходаў, аддыхаў, нерацыянальнага скарыстаньня электраэнэргіі, апалу, няправільнай арганізацыі працы. Напрыклад, ёсьць выпадкі, калі пры апрацоўцы дроўніны ў фабрыкат, пачынаючы ад лесасекі, трэціцца на адходах каля 85 проц. дроўлянай масы; у абутковай прамысловасьці траціцца на адход ад 20 да 30 проц. скуранога тавару, адходы мэталяў, асабліва на чыгуначных майстарнях, дасягаюць 80—85 проц., вялікія страты ад нерацыянальнага скарыстаньня апалу ў прамысловасьці і г. д.

У гандлі мы трацім ад няўмелага і нядбайнага хаваньня і перавозак тавараў, невыстарчальнай барацьбы з чарвямі, трацім шмат сродкаў на тару, з якое 45 проц. зусім зьнішчаецца. Шмат таксама гіне прадметаў другараднага экспарту, хатніх адкідаў, на што яшчэ можна купіць дадатковую колькасьць трактараў і машын.

Шмат сіл і сродкаў мы трацім у сельскай гаспадарцы ад няпоўнага скарыстаньня глебавых багацьцяў, рабочай жывёлы, машын, ад невыстарчальнай барацьбы са шкоднікамі, з пажарамі.

Эканомія ад зьнішчэньня ўсіх страт можа даць вялізарныя сродкі для будаўніцтва новых фабрык, заводаў, для набыцьця трактараў, для будаўніцтва кватэр, школ і г. д.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, Савет Народных Камісараў і Цэнтральны Савет Прафэсыянальных Саюзаў БССР зварачаюцца да рабочых, работніц і ўсіх працоўных Беларусі з заклікам шырока і практычна разгарнуць барацьбу са стратамі, увязваючы гэту працу з разгортваньнем рацыяналізатарскіх работ, сацыялістычным спаборніцтвам, дапамогаю рабочаму вынаходніцтву.

Задача прафсаюзных саюзаў, фабзаўмясцкомаў і вытворчых нарад непасрэдна арганізоўваць рабочых ва ўдарныя брыгады для барацьбы са стратамі ў цэху, на прадпрыемстве, у саўгасе, краме, ва ўстанове, дзеля чаго ўкараняць у гэту справу сацыялістычнае спаборніцтва, практыкаваць арганізацыю тыднёў, дэсяцідзёнак і месячнікаў па барацьбе са стратамі і ператварыць гэтыя ўдарныя заданьні ў сыстэматычную барацьбу са стратамі.

Перад камсамолам стаіць задача арганізацыі ў гатай барацьбе ўсёй працоўнай моладзі.

Сяцыялістыя павінны ўзяць на сябе распрацоўку і вывучэньне пытаньняў барацьбы са стратамі і аказаць тэхнічную дапамогу рабочым і бядняцка - серадняцкім масам сялянства ў гэтай барацьбе.

Кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў павінны мабілізаваць сілы і ўвагу адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу і ўсяго апарату на дапамогу пралетарскай грамадзкасьці ў гэтай справе.

Рашучая барацьба са стратамі забясьпечыць нам больш кароткія тэрміны выкананьня пяцігодкі. Усе на барацьбу са стратамі.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЭЙ
Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Старшыня ЦСПСБ РЫЖОЎ.

5 ДЗЕН засталося да апошняга тэрміну ссыпкі насеньня

З бальшавіцкаю настойлівасьцю і энэргіяй выканаем дырэктыву партыі

Узорны прыклад работы паказалі калгасы „Горкі" і „Новасёлкі" Бабруйшчыны

Бярэзне прыклад з камуны „Расьсьвет"

Члены с.-г. камуны «Расьсьвет», Лясьнянскага сельсавету (Круглянскі раён, Аршаншчына), пачалі ў парадку сацыялістычнага спаборніцтва ссыпку насеньня для весьнавое сяўбы.

Ініцыятарам гэтае справы зьяўляецца камунар Галкоўскі. Камунары «Расьсьвету» выклікалі ўсе камуны і калгасы Круглянскага раёну.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ

Поўнасьцю выканалі заданьне

У Стара-Дароскім раёне на першым месцы па ссыпцы насеньня ідуць калгасы «Горкі» і «Новасёлкі», якія поўнасьцю выканалі заданьне абагуленьня і ссыпкі насеньня.

Цягнецца ў хвасьце калгас «Старыя Дарогі», дзе сабрана ўсяго 5 проц. патрэбнае колькасьці насеньня.

Замацоваць дасягнуты зрух

Становішча са стварэньнем насенных фондаў па калгасах Менчыны за апошні тыдзень палепшылася. Даныя аб абагуленьні насеньня на 10-га лютага паказваюць больш - менш станоўчыя вынікі. Абагулена ўсяго 98.815 цэнтнэраў, што складае 68,2 проц. вызначанага пляну. Па бульбе плян выкананы на 74,5 проц.

З раёнаў, якія больш адстаюць у стварэньні насенных фондаў, можна назваць Плешчаніцкі (заданьне па насеньні выканана на 31 проц., па бульбе—38 проц.), Хвалюкіцкі (32 проц. па насеньні), Пухавіцкі (35,1 проц. па насеньні, 12,1 проц. па бульбе), Грэскі (41 проц. па насеньні, 25 проц. па бульбе), Чэрвеньскі (25 проц. па насеньні, 9 проц. па бульбе), Заслаўскі (47 проц. па насеньні, 7 проц. па бульбе). Гэтым раёнам трэба падцягнуцца.

Рэвалюцыйнае паўстаньне ў Інда-Кітаі

ПАРЫЖ, 12. Атрыманы паведамленьні аб рэвалюцыйным паўстаньні ў Інда-Кітаі (французкая калёнія, пагранічная з Кітаем). Паўстаньне выбухнула ў Тонкіне (партовы горад у Інда-Кітаі). сярод раскватараваных тут вайсковых часьцей, набраных з мясцовых жыхароў. Ноччу 200 паўстаўшых салдат напалі на ўзброены лягер каля Тонкіна. Забіты два афіцэры, два унтэр-афіцэры і пяць салдат. Дадатковыя атрады войск, якія прыбылі раніцою, задушылі паўстаньне. Каля 60 паўстанцаў укрыліся ў лясох. Прасьледваньне іх праводзіцца пры дапамозе самалётаў.

Рэвалюцыйныя выступленьні адзначаны і ў іншых раёнах Інда-Кітаю.

Правыя газэты ўжо гавораць аб «руцэ Масквы» і што «арганізатары паўстаньня прыбылі ў Інда-Кітай праз Кітай з СССР».

Гавас паведамляе, што адначасова з паўстаньнем у Іен-Бэі (Тонкінская правінцыя) тубыльцы напалі на вайсковы пост у Хугюа. Напад быў адбіты атрадам тубыльных войск. Ёсьць некалькі чалавек забітых і параненых з боку напаўшых. Агульная колькасьць арыштаваных да 12-га лютага—25 тубыльцаў з цыдыльнага насельніцтва і 26 тубыльных стралкоў.

Агідная бражня сацыял-фашыстага Варэна

ПАРЫЖ, 13. Францускі буржуазны друк прабуе вакрыць масавасць характару рэвалюцыйна - вызваленчага руху ў Інда-Кітаі, але прызнае... актуальнасьць пагрозы рэвалюцыі ў Інда-Кітаі.

У гутарцы з прадстаўніком «Івэра» былы генэрал - губернатар Інда-Кітаю, былы і, мусіць, будучы сацыялісты Варэн заяўляе: «Здарэньні, бязумоўна. выкліканы камуністычнаю прапагандаю. Аднак, магчыма, што тут граюць ролю і эканамічныя прычыны, у прыватнасьці, неўраджай». Газэта «Джурналь» б'е трывогу з прыводу таго, «выходзячае з Масквы камуністычнае небясьпецкі ў Інда-Кітаі» і заявачае на агульнасьць інтарэсаў Англіі і Францыі «у барацьбе з рэвалюцыйнаю небясьпекаю ва ўсіх краёх Азіі».

Апэрацыйная зводка з пасеўнага фронту

Ударная работа забясьпечыць посьпех

Плян засыпкі абагуленых насенных фондаў па калгасах БССР на 10-га лютага выканены ў сярэднім у разьмеры 65 проц.

На першых мясцох па засыпцы насенных фондаў ідуць акругі—ВІЦЕБСКАЯ (74,4 проц.), МАГІЛЕЎСКАЯ (70 проц.) і МЕНСКАЯ (68,2 проц.).

На самым апошнім месцы ідзе ГОМЕЛЬСКАЯ АКРУГА, якая паказала ТОЛЬКІ 48,9 проц. выкананьня пляну.

Калі прыняць пад увагу, што на 1-га лютага разьмер засыпкі насенных фондаў у калгасах складаў усяго толькі 32,7%, то мы павінны будзем прызнаць, што ў гэтай важнейшай справе мы маемзрух, за апошнія 10 дзён разьмер засыпкі насенных фондаў па БССР падвоіўся. Гэты зрух паказвае на тое, што мабілізацыя партыйных і грамадзкіх сіл і энэргічная работа рабочых брыгад не прайшлі дарма.

Калі мы зьвернемся да работы асобных акруг па засыпцы насенных фондаў, то мы павінны асабліва падкрэсьліць вусім слабую работу ГОМЕЛЬСКАЕ АКРУГІ, ЯКАЯ ІДЗЕ НА АПОШНІМ, НА ГАНЕБНЫМ МЕСЦЫ.

Цікава яшчэ адзначыць тое, што Менская акруга, якая яшчэ нядаўна ішла амаль што на апошнім месцы (паказаўшы на 1-га лютага засыпку насеньня на 23,2 проц.), зараз моцна падцягнулася—за апошнія 10 дзён разьмер засыпкі насеньня па Меншчыне амаль што патроіўся.

Гэты прыклад паказвае, якіх добрых вынікаў можна дасягнуць пры ўзмоцненай рабоце і мабілізацыі ўсіх сіл.

Толькі 36,9 проц.

Ачыстка насеньня па Менскай акрузе дагэтуль яшчэ не набыла належных тэмпаў. У Вузьдзенскім раёне на 10-га лютага па ачыстцы насеньня выканана толькі 36 проц. заданьня. У Грэскім—30 проц., у Заслаўскім—34,4 проц., Койданаўскім — 31 проц., Лагойскім—29,3 проц., Плешчаніцкім —21,3 проц., Вягомльскім — 18,9 проц., Астрашыцка-Гарадзецкім — 26,6 проц. і г. д.

Больш менш здавальняюча стаіць справа ў Барысаўскім раёне, дзе ачышчана 72,9 проц. усяго насеньня.

Агульны плян ачысткі насеньня па акрузе выкананы толькі на 36,9 проц.

Павольны тэмп

Райкамітэты КСУ Менскай акругі вельмі слаба разгарнулі работу па загатоўцы насеньня. Ёсьць рад раёнаў, якія выканалі свае заданьні толькі ад 5 да 12 проц. Вось некаторыя з іх: Заслаўскі раённы КСУ павінен быў загатовіць 1.200 цэнтнэраў насеньня, загатоўлена ўсяго на 10-га лютага толькі 132 цэнтн., Халопеніцкі КСУ замест 680 цэнтн., вызначаных плянам,—толькі 17 цэнтн., Лагойскі КСУ — 690 цэнтн. замест 1.525 цэнтн., Самахвалавіцкі—157 цэнтн. замест 860 цэнтн., Грэскі—370 цэнтн. замест 782 цэнтн. і інш.

Яшчэ няма баяв... тэмпаў

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Заслухаўшы інфармацыю ўпаўнаважанага Савету Народных Камісараў правядзеньні пасеўнае кампаніі тав. Рачыцкага аб ходзе падрыхтоўкі да га кампаніі, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Інфармацыю, упаўнаважанага Савету Народных Камісараў па правядзеньні пасеўнае кампаніі т. Рачыцкага аб ходзе падрыхтоўкі да гэтай кампаніі прыняць да ведама.

Адзначыць, што, ня гледзячы на рэктывы Савету Народных Камісараў да гэтага часу ў радзе найважнейшых галін падрыхтоўкі да весьнавое сяўбы яшчэ няма неабходнага пералому ў павышэньня тэмпаў падрыхтоўкі (а... маджаньне насеньня, ачыстка яго, а... нізацыя машына-трактарных і ко... трактарных станцый і г. д.).

Запрапанаваць, акруговым выкан... чым камітэтам і Белкалгаспцэнтру ... вязкова скончыць засыпку насеньня 20-га лютага ў калгасах, якія арганізаны на 1-е студзеня 1930 г., а ў напава... ганізаваных калгасах засыпку насеньня... рабіць адначасова з іх арганізацыяй.

Даручыць акруговым выканаўчым камітэтам скончыць арганізацыю і абсьліваньне рамонтных майстэрань 25-га лютага 1930 г. і ўжыць заходы каб гэтыя майстэрні мелі поўную ... грузку.

Арганізацыю машына-трактарных станцый скончыць да 1-га сакавіка 1930 г.

Запрапанаваць Белпаляводсаюзу акруговым выканаўчым камітэтам забясьпечыць у вызначаныя тэрміны ... ключэньне дагавораў на кантрактацыю.

Выходзячы з необходнасьці поўнага забясьпячэньня ўгнаеньнем мэліяраных зямель, што падлягаюць асваенню, і ў зьвязку з недахопам мінэральных угнаеньняў запрапанаваць ўпаўнаважанаму Савету Народных Камісараў па правядзеньні пасеўнае кампаніі ... ўжыць усе заходы да павялічэньня збору попелу, а таксама арганізаваць сваячасовую адпраўку яго для забясьпячэньня паказаных мясцоваў.

Даручыць ўпаўнаважанаму НК ШШ ... хсў Зносін СССР пры СНК БССР ... рагледзець тарыф на перавозку попелу на чыгунцы з тым, каб гэты тарыф ... ны вышэй існуючага тарыфу на перавозкі мінэральных угнаеньняў.

Даручыць упаўнаважанаму СНК ... правядзеньні пасеўнае кампаніі і ... шыным акруговым выканаўчым камітэтам прыцягваць да адказнасьці і ... маць з працы тых працаўнікоў, ... нядбайна адносяцца да выкананьня ... рапрыемстваў па пасеўнай кампаніі 1930 г.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарада... БССР М. КАЛЕВІЧ.

Люты і сакавік--рашаючыя месяцы

Запоўніць прарыў першага кварталу

Загад па ВСНГ БССР

Вынікі работы прамысловасьці ЗА СТУДЗЕНЬ МЕСЯЦ сьведчаць аб тым, што, ня гледзячы на невыкананьне прамфінпляну ў першым квартале і дырэктывы прэзыдыуму ВСНГ, НАЛЕЖНАГА ПЕРАЛОМУ НЕ НАСТУПІЛА.

Рад галін прамысловасьці, якія ня выканалі прамфінпляну ў 1-м квартале, паказваюць і ў студзені месяцы СКАРАЧЭНЬНЕ ВЫТВОРЧАСЬЦІ.

Асабліва дрэнна стаіць справа з разгортваньнем МЭТАЛЯАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, прырост прадукцыі якое студзень зьяўляецца зусім невыстарчальным. Зварачае на сябе ўвагу нездавальняючая работа заводаў «ПРАЛЕТАРЫ», «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» і «КАМІНТЭРН».

Нездавальняючыя вынікі адзначаюцца і па ТЭКСТЫЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, якая за 1-шы квартал ня выканала праграмы, прычым СТУДЗЕНЬ МЕСЯЦ НІЯКІХ ЗЬМЕН НЯ ПРЫНЁС.

Слаба стаіць справа з разгортваньнем СКУРАНА - АБУТКОВАЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, асабліва скуранае, па якой нагляданецца невыстарчальная актывізацыя мерапрыемстваў, накіраваных да зьнішчэньня недахопаў.

Дрэнна працуе і ЗАПАЛКАВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ, якая пасьля адзначанага недавыкананьня пляну ў 1-м квартале, паказвае ў студзені ДАЛЕЙШАЕ АДСТАВАНЬНЕ ВЫТВОРЧАСЬЦІ АД ПЛЯНАВЫХ ВЫЗНАЧЭНЬНЯЎ. Асабліва дрэнна стаіць справа з работай запалкавых фабрык «10-ты КАСТРЫЧНІК» і «ВЭЗУВІ».

Слабы тэмп разгортваньня вытворчасьці наглядаецца і ў ДРЭВААПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, асабліва па БАБРУЙСКІМ КАМБІНАЦЕ, заводах: «ПРАЛЕТАРЫ», ІМЯ ВАРОЎСКАГА, ІМЯ ФРУНЗЭ, ПОЛАЦКІМ ЛЕСАПІЛЬНЫМ ЗАВОДЗЕ, ВІЦЕБСКІМ ФАНЭРНЫМ ЗАВОДЗЕ «АДРАДЖЭНЬНЕ», ФАНЭРНЫХ ЗАВОДАХ «ВЭЗУВІ» і «ДНЯПРО».

Поўнасьцю не пакрывае выкананьня пляну за 1-шы квартал і ПАПЯРОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ.

Слабы тэмп разгортваньня вытворчасьці, які яшчэ не кампэнсуе прарыву, што стварыўся ў 1-м квартале, наглядаецца і па ГАЛЯНТАРЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ, МАХОРАЧНАЙ І АКУЛЯРНАЙ.

Зусім дрэнна працуе і ПАЛЕСДРУК, які пасьля невыкананьня пляну за 1-шы квартал на 18 проц., у студзені дае скарачэньне вытворчасьці.

Такім чынам, неабходна канстатаваць, што СТУДЗЕНЬ МЕСЯЦ НЯ ТОЛЬКІ НЕ ПАКРЫВАЕ НЕДАВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗА 1-ШЫ КВАРТАЛ, АЛЕ І ПА РАДЗЕ ГАЛІН ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ДАЕ ПАЎТОРНАЕ АДСТАВАНЬНЕ ВЫТВОРЧАСЬЦІ АД ПЛЯНУ.

Аналіз прычын недавыкананьня пляну, як відаць з вынікаў апошніх абсьледваньняў раду прадпрыемстваў, лішні раз пацьвярджае, што нездавальняючая работа прамысловасьці на працягу першае трэцяе часьці году ў значнай меры тлумачыцца ўнутрыпрамысловымі фактарамі, гэта значыць, што АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНЫ ПЭРСАНАЛ АКАЗАУСЯ НЕ НА НАЛЕЖНАЙ ВЫШЫНІ.

З прычыны таго, што ЛЮТЫ І САКАВІК месяцы павінны стаць РАШАЮЧЫМІ ў сэнсе выкананьня асноўных паказальнікаў прамфінпляну, трэба паведсьці рашучую барацьбу за ажыцьцяўленьне гэтай ударнай і баявой задачы, якая набывае ян гаспадарчае, так і вельмі важнае палітычнае значэньне.

Выкананьне прамфінпляну павінна стаць У ЦЭНТРЫ УВАГІ ТРЭСТАЎ, КОЖНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА, КОЖНАГА ЦЭХУ, УСЯГО АДМІНІСТРАЦЫЙНА - ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ, А ТАКСАМА І ЎСЯГО АПАРАТУ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ПАЧЫНАЮЧЫ З ВСНГ БССР І КАНЧАЮЧЫ ЗАВОДЗКІМІ ЯЧЭЙКАМІ.

На падставе гэтага загадваю:

а) вакол пытаньня работы прамысловасьці МАБІЛІЗАВАЦЬ УВЕСЬ АПАРАТ І ГРАМАДЗКАСЬЦЬ;

б) кіраўніком трэстаў НЕ ПАЗЬНЕЙ 15-га ЛЮТАГА камандыраваць патрэбную колькасьць тэхпэрсаналу на прадпрыемствы, асабліва на тыя, якія адзначаюць найбольшае адставаньне ад заданьняў, з тым, каб шляхам ажыцьцяўленьня канкрэтных мерапрыемстваў выправіць існуючыя недахопы;

в) у аснову мерапрыемстваў палажыць апошнюю пастанову прэзыдыуму ВСНГ БССР па дакладу аб выніках абсьледваньня прадпрыемстваў;

г) усім кіраўніком трэстаў далажыць прэзыдыуму ВСНГ БССР НЕ ПАЗЬНЕЙ 17-га ЛЮТАГА аб ужытых мерапрыемствах у ажыцьцяўленьне п. «б» гэтага загаду і не пазьней 10-га сакавіка — аб канкрэтных выніках праведзенае работы ў забесьпячэньне выкананьня прамфінпляну.

Прымаючы пад увагу, што яшчэ вельмі дрэнна стаіць справа з інфармацыяй прэзыдыуму аб ходзе работы прамысловасьці, яшчэ раз напамінаецца ўсім кіраўніком трэстаў і прадпрыемстваў аб не абходнасьці ўзяць рашучы курс на сваячасовае прадстаўленьне устаноўленых статыстычных вестак, асабліва ў галіне сабекошту.

Нам. старшыні ВСНГ БССР ВАСКАБОЙНІКАЎ.
Сакратар ВСНГ БССР ІЗАКАЎ.
13-га лютага 1930 г.

ДА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЛЁТУ „ЛК"

VIII зьезд УсеЛКСМ паставіў задачу стварыць такі рух пралетарскай моладзі, які-б дапамог органам РСІ змагацца з бюракратызмам і цяганінай за ўмацаваньне савецкага апарату. Зьезд высунуў ідэю стварэньня такога добраахвотнага руху сярод рабоча-сялянскай моладзі, які-б быў магутным зьвяном сувязі паміж РСІ і шырокімі пралетарскімі масамі

Безадкладна пасьля зьезду пачалі стварацца групы «лёткае кавалерыі». У першы час групы ствараліся савецкімі ячэйкамі і галоўная ўвагі іх была згрупавана наўкола работы апарату, але хутка «Л. К.» стыхійна ператварылася ў масавы рух моладзі. Хутка «Л. К.» пачала адчувацца і на заводах і фабрыках, а ў апошні час пачала прасякаць і ў вёску.

У дзейнасьці груп «Л. К.» ёсьць нямала посьпеха і дасягненьняў. У асноўным кіраўніцтва работай «Л.К.» было бясспрэчна правільным, але з усёй рашучасьцю трэба падкрэсьліць, што вельмі часта кіраўніцтва работай «Л. К.» на месцох не знаходзілася на належнай вышыні Ёсьць цэлы рад фактаў, калі жывое выраэнае кіраўніцтва дзе-ні-дзе на месцох падмяняецца камандваньнем. імкненьнем абмежаваць і затармазіць масавы рух «Л. К.», заціснуць ініцыятыву «лёткіх кавалерыстых».

Бясспрэчна, што такія факты недапушчальны, што мы павінны пасьлядоўна ўзмацняць кіраўніцтва штодзённай работай «лёткай кавалерыі».

Гіганцкія задачы, пастаўленыя партыяй па сацыялістычнай рэканструкцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі і ліквідацыя кулацтва, як класы, на аснове суцэльнае калектывізацыі, патрабуюць вялізарнейшай мабілізацыі пралетарскіх мас. Патрэбна пасьлядоўная і ўпартая барацьба з усякімі бюракратычнымі скажэньнямі лініі партыі, патрэбна бязьлітаснае змаганьне з бюракратызмам і цяганінай, якія перашкаджаюць выразнаму ажыцьцяўленьню гэтых задач. Таму «Л. К.», як масавы рух і магутная зброя барацьбы з бюракратызмам, мае вялізарнае значэньне.

Зараз ужо наступіў час, калі трэба ўдасканаліць работу «Л. К.», прыстасаваць яе да задач, якія стаяць перад краем, перабудаваць яе работу адпаведна новым тэмпам і задачам сацыялістычнага будаўніцтва. У гэтым, у асноўным, заключаецца задача, якая стаіць перад усебеларускім зьлётам «Лёткай кавалерыі», што адкрываецца сёньня.

Зараз «Лёткая кавалерыя» павінна ня толькі змагацца з бюракратызмам і цяганінай. «Л. К.» павінна вызначыць сваю ролю на прадпрыемстве, у сельскай гаспадарцы, калгасе, саўгасе і г. д. «Л. К.» павінна аднаў з сваіх асноўных і баявых задач зрабіць барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Таму ўсебеларускі зьлёт асноўнымі сваімі пытаньнямі і ставіць пытаньні гаспадарчага будаўніцтва і работу савецкіх органаў. Зьлёт павінен вызначыць канкрэтныя формы і мэтады работы «Л. К.» у адпаведнасьці з разгорнутым сацыялістычным будаўніцтвам, прыстасаваўшы іх да задач барацьбы за прамфінплян і да ўзмацненьня суцэльнага калгаснага руху.

У сувязі з тым, што «Л. К.» пачала прасякаць і ў дзіцячы рух, зьлёт сяцыяльна абмяркуе гэта пытаньне. На зьлёце будзе працаваць спэцыяльная дзіцячая сэкцыя, якая вызначыць далейшыя шляхі для разьвіцьця дзіцячай ініцыятывы ў барацьбе з бюракратызмам.

Усе гэтыя пытаньні зьлёт можа вырашыць толькі тады, калі паўкола яго будзе створана шырокая грамадзкая думка. У гэтым напрамку рашаючую ролю павінна адыграць наша прэса. Нельга сказаць, што да гэтага часу наш друк зварачаў патрэбную ўвагу на пытаньні работы груп «Л. К.». Газэты асьвятляюць работу «Л. К.» у большасьці сусім нездавальняюча. Зразумела, што гэты недахоп павінен быць выпраўлены. Трэба прыкаваць нашу ўвагу да работы зьлёту. Толькі пры гэтай умове зьлёт вдолее поўнасьцю выканаць задачы, якія стаяць перад ім.

РЫНДЗІЧ.

Хадайніцтва аб узнагародзе тав. Сталіна

МАСКВА, 14. На пасяджэньні Савету Нацыянальнасьцяй пры ЦВК СССР выступіў тав. СКРЫПНІК з прычыны пяцідзесяцігодзьдзя тав. СТАЛІНА. Прэзыдыум Савету Нацыянальнасьцяй ухваліў наступную пастанову:

1. Прэзыдыум Савету Нацыянальнасьцяй адзначаючы, што тав. Сталін — самы непахісны і пасьлядоўны вучань Леніна, які задоўга да рэвалюцыі распрацаваў тэарэтычныя асновы і практычныя крокі вырашэньня нацыянальнага пытаньня, пасьля рэвалюцыі таксама пасьлядоўна і паленінску цьвёрда кіраваў Народным Камісарыятам Нацыянальнасьцяй і вынес на сваіх плячох усю тую вялікую работу, якая падрыхтавала магчымасьць правільнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня на практыцы — стварэньне саюзных рэспублік і Саюзу ССР і ўзмацненьне брацкага супрацоўніцтва ўсіх народаў Саюзу ССР — пастанаўляе выдаць спэцыяльны і шырока распаўсюдзіць сярод працоўных досьлед аб'дзейнасьці Народнага Камісарыяту па справах нацыянальнасьцяй, якім кіраваў тав. Сталін.

2. Адзначаючы вялізарную работу і ролю тав. Сталіна ў часе грамадзянскае вайны, як у галіне вайсковай, так і ў вырашэньні нацыянальнага пытаньня—прэзыдыум Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК Саюзу ССР пастанаўляе ўзьняць перад прэзыдыумам ЦВК Саюзу ССР пытаньне аб узнагародзе тав. Сталіна ордэнамі Чырвонага і Працоўнага Сьцягу.

Карумідзэ--арганізатар выбуху ў Сафійскім саборы

БЭРЛІН, 7. Паводле паведамленьня левай газэты «Вельт ам Абэнд», галоўны абвінавачаны на працэсе падрыхтоўкі чырвонцаў Карумідзэ ня раз намякаў у ходзе працэсу, што ён прымаў удзел у арганізацыі выбуху ў Сафійскім саборы 16 красавіка 1925 году. Як відома, гэты зьрыў пасьлужыў прычынаю да крывавых рэпрэсій супроць камуністых.

З Аўганістану

Паўстаньне пляменьняў супроць Надыр-хана

ЛЁНДАН, 13. Паводле вестак «Дэйлі Тэлеграф», у Аўганістане паўстанцы з племя пшывары занялі Тархан (на поўдзень ад Стабулу. у Вазарыстане) і адбілі спробу атрадаў Надыр-хана зноў заханіць гэты пункт. Па тых-жа вестках, пляменьні махмандзі згуртоўваюцца вакол Джэлалабада, пагражаючы напасьці на горад. У сучасны момант усе гандлёвыя апэрацыі паміж Індыяй і Аўганістанам знаходзяцца ў стане поўнага застою.

ЗА 14 ДЗЕН АРЫШТАВАНА 3 АДКАЗНЫХ РЭДАКТАРЫ „РОТЭ ФАНЭ"

БЭРЛІН, 13. Паліцыя ўчора арыштавала адказнага рэдактара «Ротэ Фанэ» тав. Хаісьвірта. Такім чынам, за апошнія 14 дзён арыштаваны ўжо трэці рэдактар «Ротэ Фанэ».

Сварка ў фашыстцкай сям'і

ВАРШАВА, 14. Ва ўрадавых колах зрабіў вялікае ўражаньне канфлікт, які здарыўся на пасяджэньні камісіі сойму, створанай для расьсьледаваньня падзей у сойме 31 кастрычніка (калі афіцэрамі быў заняты вэстыбюль сойму). Старшыня камісіі нац.-дэмакрат Чацьвяртынскі адмовіўся абвясьціць ліст Пілсудзкага, у якім зьмешчана грубая лаянка на адрасе старшыні сойму Дашынскага. Дэпутаты беспартыйнага блёку патрабавалі, каб ліст быў агалошаны. У адказ на катэгарычную адмову Чацьвяртынскага, пілсудчыкі абвясьцілі сваю дэкларацыю, у якой заявілі, што ніхто ня мае права рабіць цэнзуры лісту Пілсудзкага. Што-ж датычыцца слоў, напрыклад, «экар яцелы хлус», якія пісаў Пілсудзкі на адрасе Дашынскага, дык у гэтых словах пілсудчыкі ня бачаць нічого выключнага.

Пасьля агалашэньня гэтай дэкларацыі паседжаньне камісіі было спынена.

Варшаўская паліцыя закупае танкі і браніўкі

Варшаўская паліцыя старанна «мэханізуе» свае сілы в мэтаю масавага забойства рабочых, разгону дэманстрацый і задушэньня рэвалюцыйных выступленьняў. Зараз, як падае польскі друк, паліцыя закупляе для гэтае мэты танкі і браніявыя аўтамабілі.

Польская паліцыя, як відаць, гэтыя весткі не спадабаліся і яна зьмяшчала ў афіцыйных фашысцкіх органах вельмі характэрнае «абвяржэньне». Там гаворыцца, што паліцыя закупляе «звычайныя грузавыя аўтамабілі», «сьцены якіх будуць пакрыты 2-міліметравай броняй для абароны паліцэйскіх, якія сядзяць унутры, ад куляў».

Эьмена ў рэвалюцыйнага студзеньскага аб'яднанага пленуму МК і МКК Усе КП(б)

МАСКВА, 12. У рэвалюцыі студзеньскага аб'яднанага пленуму МК і МКК УсеКП(б) галасаваньнем членаў МК і МКК, па прапанове бюро МК, уносіцца наступная эьмена. Замест ранейшай фармулёўкі:

«Пленум МК і МКК адзначае, што... рад усёй партыяй і Маскоўскай аб... ной арганізацыяй стаіць, як важ... шая, высунутая ЦК палітычная за... —ліквідацыя кулацтва і новай бур... зіі ў цэлым, як клясы, у Савецкай д... жаве», — зацьверджана наступная ф... мулёўка:

«Пленум МК і МКК адзначае, што... рад усёй партыяй і Маскоўскаю аб... ной арганізацыяй стаіць, як важ... шая, высунутая ЦК, палітычная за... —ліквідацыя кулацтва, як клясы, у... вецкай дзяржаве, на базе суцэльнае... лектывізацыі і ў адпаведнасьці з... праўдным удзелам бядняцка - се... няцкіх мас у калгасным будаўніц... Разам з тым, неабходна працягваць... лейшае выцісканьне капіталістычн... элемэнтаў гораду на аснове ўзмацне... ня ўсяе работы па сыстэматычны... яшчэ больш поўным ахопе рынку д... жаўным і каапэрацыйным гандлем...

Новае назначэньне т. Пятакова

навіў назначыць тав. Пятакова члена Савету Працы і Абароны.

НОВЫ АЎГАНСКІ ПАСОЛ У МАСКВЕ

МАСКВА, 14. 14-га ранічай у Маскву прыбыў новы Аўганскі надзвычайны поўнамоцны пасол у СССР Мухаме... Азіз-хан.

КАМПАРТЫЯ ПОЛЬШЧЫ НА ШЛЯХУ ДА ЗАВАЯВАНЬНЯ МАС

СЁМЫ ПЛЕНУМ ЦК КАМПАРТЫІ ПОЛЬШЧЫ

БЭРЛІН, 6 лютага. Паводле атрыманых тут вестак, пядаўна скончыўся сёмы пленум ЦК кампартыі Польшчы. Пленум канстатаваў, што адным з галоўнейшых задач кампартыі Польшчы зьяўляецца барацьба супроць імпэрыялістычнай вайны і за абарону СССР.

У сувязі з 10-ай гадавінай савецка-польскай вайны, якая адбудзецца ў красавіку, кампартыя Польшчы павінна сваячасова пачаць кампанію пад лёзунгам выкрыцьця імпэрыялістычных плянаў фашызму, за абарону СССР і за рэвалюцыйную салідарнасьць з Чырвонай армією. У

Сёньня адкрываецца ўсебеларускі зьлёт „лёгкай кавалерыі“

На перадавыя пазыцыі сацыялістычнага наступленьня

Усебеларускі зьлёт «лёгкай кавалерыі» павінен вырашыць рад задач, якія стаяць перад камсамолам як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы. «Лёгкая кавалерыя», як форма масавага руху, у сваіх радах аб'ядная тысячы перадавых камсамольцаў. Перад зьлётам нельга не адзначыць тэй работы, якую правяла «лёгкая кавалерыя» за апошнія часы. Камсамол праз свае перадавыя атрады дапамог партыі ў барацьбе з бюракратызмам, цягнінай у падрыхтоўцы і правядзеньні чысткі савецкага апарату, у мабілізацыі ўвагі рабочых вакол задач генеральнай чысткі партыі.

Рабочыя зьлёты «лёгкай кавалерыі», якія нядаўна адбыліся, падагулілі работу сваіх груп у сацыялістычным будаўніцтве. Групы лёгкай кавалерыі **Талочынскай** камсамольская арганізацыі (Аршанская акруга) за апошні год правялі звыш 36 налётаў на рашкі і сельскія установы. У часе налётаў выкулен рад абурэчных непаразкаў у рабоце фінадзелу, райвыканкому, спажывецкай кааперацыі і г. д. Больш за дзесятак людзей, сацыяльнаворожых сваёй ідэалёгіяй, былі зьняты з работы ў савецкім апараце, па матар'ялах груп лёгкай кавалерыі.

Ня гледзячы на відавочныя посьпехі ў рабоце лёгкае кавалерыі, усё-ж мы павінны канстатаваць, што асобныя групы лёгкай кавалерыі да сёньняшняга дня не паставілі перад сабою задач, над вырашэньнем якіх у сучасны момант працуе партыя, улада і камсамольская арганізацыя ў цэлым. Паводле матар'ялаў з месц відаць, што асобныя групы «Л. К.» вельмі часта **абмяжоўваюцца** «кавалерыйскімі» налётамі на амбулятоpы, дзіцячыя яслі, асобныя савецкія ўстановы і забываюць пра асноўныя гаспадарчыя задачы.

З месц даходзяць весткі аб тым, што асобныя атрады лёгкай кавалерыі ўсё яшчэ займаюцца на вытворчасьці «кавалерыйскімі» налётамі замест настойлівай і глыбокай работы над выкананьнем прычын, чаму тое ці іншае прадпрыемства ня выконвае заданьняў на прамфінплянe, чаму яно ганебна адстае ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Атрады лёгкае кавалерыі вельмі часта ня ведаюць, як практычна падыйсьці да вытворчасьці і з чаго пачынаць. Як РСІ, так і фабрычна-заводзкія арганізацыі камсамолу часамі вельмі дрэнна кіруюць работай «Л. К.».

На некаторых прадпрыемствах заводзкія арганізацыі часамі нядоцэнны выкарыстаць «Л. К.», ня могуць накіраваць багатай ініцыятывы і энтузіязму рабочай моладзі ў патрэбнае рачышча.

Лёгкая кавалерыя павінна неадкладна ўключыцца ў агульную барацьбу за выкананьне прамфінплану, за выкананьне тэрмінаў абагуленьня сродкаў вытворчасьці і ссыпці насеньня ў бясцы.

Усебеларускі зьлёт, які сёньня адкрываецца, павінен ня толькі абагульніць практыку сваіх атрадаў, але і зрабіць крок уперад ад «кавалерыйскіх налётаў» да настойлівае штодзённае работы «Л. К.» па ўдзеле ў сацыялістычным перабудаваньні краю.

Кінуць атрады лёгкае кавалерыі на барацьбу за якасьць прадукцыі, за павышэньне прадукцыйнасьці працы, за выкананьне заданьняў па прамфінплане — асноўная задача беларускага камсамолу.

Кавалерыстыя—на перадавыя пазыцыі ўдарніцтва, у лік застрэльшчыкаў камуністычнае працы!

Лёгкая кавалерыя—на перадавыя пазыцыі сацыялістычнага змаганьня! На фронт барацьбы за абагуленьне сродкаў вытворчасьці ў калгасах, за хутчэйшы тэмп калектывізацыі і на яе аснове — ліквідацыі кулацтва, як клясы!

Ул. М.

Атрадам лёгкай кавалерыі

Прывітаньне ЦКК-РСІ

У перыяд наскоранага тэмпу індустрыялізацыі, сацыялістычнае перабудовы сельскае гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, барацьба з бюракратызмам, на спрашчаньне і паталяньне дзяржэфнага апарату зьяўляецца асабліва важнай задачай партыі і ўлады.

Перад органамі ЦКК-РСІ ў сувязі з гэтым паўстаюць вялізарныя задачы: арганізацыя масавага кантролю і праверкі фактычнага выкананьня дзяржапаратам важнейшых дырэктыў партыі і ўрада, палепшаньня асабістага складу нашага апарату. Ва ўсёй гэтай рабоце «лёгкая кавалерыя» заваявала вельмі значнае месца. За параўнальна невялікі перыяд дзейнасьці атрадаў «лёгкай кавалерыі», яны паказалі сябе, як найбольш гібкія і здольныя памочнікі органаў РСІ ў справе барацьбы з бюракратызмам.

ЦКК-РСІ выказвае ўпэўненасьць, што ўсебеларускі зьлёт паслужыць моцным штурхачом для яшчэ больш шырокага разгортваньня работы атрадаў «Л. К.» на правяроны выкананьня важнейшых дырэктыў партыі адносна паскоранага тэмпаў, абмяжоўваньня пяцігодкі, прамфінплану, правядзеньня калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Шчырае прывітаньне дэлегатам усебеларускага зьлёту—актыўным змагаром на фронце сацыялістычнага будаўніцтва!

Першаму ўсебеларускаму зьлёту лёгкай кавалерыі! рэдакцыі газэты „Зьвязда“ шле сваё шчырае прывітаньне

„Дняпроўскую Мануфактуру“--на чорную дошку

ФАБРЫКА 2 ДНІ ПРАЦУЕ, ТРЭЦІ СТАІЦЬ

Злачынныя адносіны фабрычных арганізацый зрываюць прамфінплян.—За мінулы год прамфінплян недавыкананы на 30 проц., за першы квартал бягучага году--на 9 проц., за студзень--на 32 проц., за 10 дзён лютага--на 31 проц.

Дырэктар--КІРЭЕУ, старшыня фабкому--АЛЕЙ, сакратар парткалектыву--ШТУКІН

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта*)

ВОРША, 14-II. (Наш кар.). Фабрыка „Дняпроўская Мануфактура“ за першыя 10 дзён лютага недавыканала вытворчае праграмы на 31 проц.

Ганебныя лічбы

Мінулы гаспадарчы год нічому не навучыў фабрычныя арганізацыі. Ня гледзячы на недавыкананьне вытворчае праграмы на 30 проц., яны не завастрылі ўвагі рабочых вакол гэтага правалу.

Таксама рэагавалі фабрычныя арганізацыі, калі вытворчая праграма за першы квартал была недавыкананa на 9%, прадукцыйнасьць працы, замест 22%, узьнята толькі на 7%, сабекошт, замест 13,7%, зьніжаны толькі на 3,1%. Зусім спакойна аднесьліся яны і да таго, што прастоі расьлі з кожным днём і вырасьлі за першы квартал да 60.000 варштата-гадзін, што дае ў сярэднім звыш 2½ гадз. прастою **на кожны варштат у дзень.** Ці варта гаварыць аб тым, што фабрыка недавыпрацавала «якіх-небудзь» 180.000 мэтраў рознае тканіны, што фабрыка мела дзесяткі тысяч рублёў страт? Ці заслугоўвае ўвагі рост прагулаў па нягрунтоўных прычынах, якія **перавысілі сярэднюю лічбу прагулаў апошняга кварталу мінулага гаспадарчага году?** Ці варта гаварыць аб такой «драбніцы», як рост браку з 1.600 мэтраў у сярэднім у мінулым годзе да 7.000 мэтраў у сярэднім у гэтым годзе?

Фабрычныя арганізацыі лічылі ўсе гэтыя пытаньні **драбніцамі** і не мабілізавалі грамадзкае думкі на ліквідацыю гэтых прарываў, ня лічылі патрэбным біць трывогу і ўсе сілы кінуць на выкананьне прамфінплану.

Гэта спрыяла яшчэ большым прарывам **у студзені.** Фабрыка за студзень недавыканала вытворчай праграмы **на 32%** і недавыпрацавала каля **200 тыс. мэтраў рознае тканіны.** Толькі адзін гэты месяц даў 25 тыс. варштата-гадзін прастояў. Увесь жах гэтае лічбы можна ўявіць сабе толькі тады, калі сказаць, што фабрыка ў сярэднім **два дні працуе і трэці дзень стаіць.**

Вялізарнейшыя разьмеры браку, «угара», вялізарнейшая колькасьць прагулаў, спазьненьняў, частыя выпадкі п'янства ў часе работы, нават выпадкі шкодніцтва — вось што характарызуе работу фабрыкі.

Без кіраўніцтва

Асноўная прычына, якая прыняла фабрыку да такога сумнага становішча — адсутнасьць правільнага кіраўніцтва з боку «трыкутніка», асабліва з боку адміністрацыі.

Новае абсталяваньне купілася бяз усякае сыстэмы. Новыя машыны і варштаты цэлымі гадамі валяліся бяз руху, частка з іх валяецца і зараз. Напрыклад, 114 варштатаў сыстэмы «Нотрон» паўгода ня былі скарыстаны. 50% гэтых варштатаў пасьля ўстаноўкі бязьдзейнічаюць, з прычыны адсутнасьці ўтку і скачоў.

Шліхтавальная машына коштам у дзесяткі тысяч рублёў учо год стаіць без руху, накрытая іржой. А ўстанавіць машыну можна было-б **за тры тыдні.** Новыя перамотачныя машыны таксама не скарыстоўваліся на працягу 4-х месяцаў у той час, калі на фабрыцы працавалі манцёры і машыны можна было ўстанавіць і ўніякуць прастояў.

Шыльныя барабаны **каля году** бязьдзейнічалі, з прычыны адсутнасьці кольцаў і запасных частак. Цяпер і зараз барабаны працуюць з перабоямі. Для закупкі машыны для мятальнага цэху пасылай бухгальтара фабрыкі, які нічога не разумее ў машынах. Таму ён і купіў зношаную і негодную машыну. Нядаўна ўстаноўлены рухавік працуе з перабоямі таму, што ён вельмі зношаны. Ня лепш працуе крыжавая мяшына.

У хвасьце адсталых

Адміністрацыя фабрыкі ігнаравала і ігнаруе нават лепшыя рацыяналізатарскія прапановы рабочых. Пры агляндзе работы вытворчых нарад рабочыя ўнесьлі каля 500 прапаноў і ўсе гэтыя прапановы засталіся бяз усякіх вынікаў. Гэтаму яшчэ спрыяла тое, што вытворчыя нарады вельмі рэдка скліканцца, а вытворчая камісія амаль не працуе.

Аб хвасьцыаме адміністрацыі сьведчыць наступны выпадак. Дзьве камсамолкі мятальнага цэху перайшлі працаваць з 10 вераценн на 15. Зразумела, што адсталыя работніцы цэху былі не задаволены гэтым пераходам. Партыйная ячэйка і камуністыя, якія працуюць у гэтым цэху, не падтрымалі ініцыятывы камсамолак. Пасьля адзнаго дня работы адміністрацыя забаранила камсамолкам працаваць на 15 вераценах, бо, наперакор, бачыце, камсамолкі будуць шмат зарабляць, а падтуе, гэта нязручна для іншых. Такім чынам, адміністрацыя апалялася ў хвасьце адсталай групы работніц.

Гэта — не адзіны выпадак. Адміністрацыя, ведаючы аб папойках на фабрыцы, аб радзе хуліганскіх учынкаў асобных рабочых, ня прымае ніякіх мер для барацьбы з гэтымі зьявішчамі.

Чорная і чырвоная дошкі не скарыстоўваюцца і зьмяшчаюць выключна абвесткі і загады адміністрацыі.

Нічога дзіўнага ў гэтым няма. Адміністрацыя ня мае часу цікавіцца работаю фабрыкі. Большая частка службовага часу дырэктара, намесьніка дырэктара, тэхнічнага кіраўніка і інш. тэхнічнага персаналу трацілца на склокі і падседжваньне. Зразумела, што склочнікам не да інтарэсаў вытворчасьці.

Фабрыка расьце, а кадраў няма

За апошні год фабрыка значна вырасла. У ліпені мінулага году была пушчана трэцяя зьмена, набрана звыш 300 новых рабочых і работніц. Але гэтыя новыя кадры ня былі падрыхтаваны і наогул яны былі прыняты на фабрыку напярэдадні пуску трэцяй зьмены. Слабая кваліфікацыя новых рабочых на працягу ўсяго часу дае сябе моцна адчуваць. 40% рабочых ледзь выробляюць 50-70% нормы.

Адсутнасьць кваліфікаванай рабочай сілы цягне за сабою прастоі варштатаў і вялікую колькасьць браку. Між тым, нічога ня робіцца для таго, каб адкрыць школу фабзавучу. Пытаньню падрыхтоўкі рабочай сілы не аддаецца ніякай увагі. Пытаньне аб пераходзе фабрыкі на 7-гадзінны рабочы дзень і пераход на трэцюю зьмену на фабрыцы амаль не абгаворвалася.

Сацдагавор падшыты да справы

Сацспаборніцтва — асноўны мэтад работы кожнага сацыялістычнага прадпрыемства — на «Дняпроўскай Мануфактуре» ня ўжываецца. Фабрыка заключыла саздагавор з фабрыкай імя Кляры Цэткін (Віцебск). Дагавор мае дзесяткі вельмі добрых пунктаў. Падпісваючы дагавор, прадстаўнікі фабрыкі абяцалі выканаць прамфінплян на ўсе 100%. Але ўсё гэта было толькі гучнымі фразамі і падпісаньне дагавору насіла выключна **парадны характар.** І пасьля падпісаньня дагавору фабрыка працягвала працаваць пастарому.

У часе правядзеньня агляду ходу сацспаборніцтва 180 лепшых рабочых з 900 стварылі ўдарныя брыгады. Але ініцыятыва рабочых ня была падтрымана фабрычнымі арганізацыямі і брыгады разваліліся.

Зараз з 1.000 рабочых няма ні аднаго, хто-б прымаў удзел у сацспаборніцтве.

Прамфінплян да цэху не даведзены

Прамфінплян на фабрыцы не абгаворваўся нават на вытворчых нарадах. Да цэхаў прамфінплян не даведзены. Майстры цэхаў ня ведаюць аб норме работы сваіх цэхаў. Таксама ня ведаюць аб нормах і рабочыя. Да гэтага часу не праведзена замацаваньне пэўнага асартымэнту за тым ці іншым варштатам.

Працдысцыплінай і ня пахне

Адсутнасьць кіраўніцтва і добрага нагляду за работай выкарыстоўваецца асобнымі групамі адсталых рабочых і работніц. Напрыклад, у мятальным цэху частка работніц, каб уніякуць спагнаньня за вялікую колькасьць браку, кідаюць у сьмяцьцёвыя скрынкі і ўборныя каптоўную пражу, або рвань, якую можна было-б яшчэ выкарыстаць.

У фарбавальным аддзяленьні выдатнаецца вялікая колькасьць фарбы, якасьць афарбоўкі дрэнная. У падрыхтоўчым цэху за работай ніхто не наглядае, у цэху шмат пепаладак, ад чаго культае работа ў іншых цэхах. Спазьненьне на работу на 15-20 мінут — звычайнае зьявішча.

На фабрыцы наглядаецца шмат выпадкаў сымуляцыі. Некаторыя рабочыя часова выконваюць прыватныя заказы. Пры выяўленьні такіх выпадкаў фабрычныя арганізацыі абмяжоўваліся затрыманьнем выплаты пэнсіі з страхкасы і ніякіх вываду з гэтых фактаў не рабілі.

Прымірэнцтва прафарганізацыі

Ня гледзячы на ўсе гэтыя ганебныя зьявішчы, прафарганізацыя не мабілізуе грамадзкае думкі на барацьбу з імі. Фабком яшчэ да гэтага часу не перабудаваў свае работы па новых нормах і мэтадах. Цэхпрафбюро не арганізаваны. Камісіі фабкому працуюць дрэнна. З новымі рабочымі ніякай працы не вядзецца. Культработы амаль няма.

Рамонт клюбу, які можна было скончыць на працягу 2-х месяцаў, цягнуўся цэлы год.

Былі выпадкі, калі перадавыя рабочыя самі прыходзілі ў фабком і прапанавалі разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва. Фабком тады адказваў: «Пачакайце, яшчэ няма анкет». Бачыце, фабкому патрэбны былі анкеты для ўліку ўдзельнікаў сацспаборніцтва.

Але што казаць аб фабкоме, калі і **цэнтральнае праўленьне саюзу тэкстыльшчыкаў** мала цікавіцца работай фабрыкі. Прадстаўнік ЦП саюзу сядзеў на фабрыцы каля **месяца** і амаль нічога не зрабіў у галіне разгортваньня сацспаборніцтва і ўзмацненьня работы па выкананьні прамфінплану. Ведаючы аб правалах на фабрыцы, ЦП саюзу ніякіх мер для паляпшэньня працы не прыняло.

Вось толькі частка фактаў, якія адбіліся на выкананьні вытворчых праграм. Мы яшчэ не закранулі ролі парткіраўніцтва, ролі насьценнай газэты і наогул кіраўніцтва рабкорамі і г. д. Аб гэтым скажам у наступнымі нарысе.

ФАЛЬКО.

Дуброўна, 12/II 1930 г.

***) Гэты нарыс зьяўляецца вынікам азнаямленьня нашага спэцыяльнага карэспандэнта са становішчам на фабрыцы «Дняпроўская Мануфактура», якога рэдакцыя камандыравала ў Дуброўну ў адказ на адкрытыя ліст рэдкалегіі і групы рабочых «Дняпроўскае Мануфактуры», зьмешчаны ў «Зьвязьдзе» 8-га лютага.**

Насьпеўшае пытаньне

Палепшыць арганізацыю мас вакол работы РСІ

Бурны рост актыўнасьці рабочае клясы, добраахвотніцкі рух па лініі ўдзелу мас у рабоце рабоча-селянскай інспэкцыі, як шэфства над дзяржапаратам паасобных прадпрыемстваў, групы садзейнасьці РСІ на прадпрыемствах, «лёгкая кавалерыя» і г. д. — патрабуюць зараз самага рашучага ўзмацненьня арганізатарскай работы з масамі. Пры слабасьці кіраўніцтва і інструктаваньня, пры невыстарчальнасьці «навучаньня» мас марацьбе з бюракратызмам, усьведамленьня мэтадаў кантролю і праверкі работы апарату адзін колькасны рост актыўнасьці мас будзе няўхільна паслабляць якасьць і выпікі ўдзяленьня ўсё новых і новых «кантралёраў» з мас.

На гэты бок работы НК-РСІ зараз заварачае асаблівую ўвагу. У сувязі з паширэньнем апаратаў акруговых РСІ, паводле пастановы апошняга пленуму ЦКК УсеКП(б), трэба дабіцца, каб арганізацыйна інструктарскі апарат РСІ быў вылучаны ўсюды, каб было наладжана сыстэматычнае кіраўніцтва і абагульненьне практыкі ўдзяленьня мас. Асноўныя формы ўдзелу мас у рабоце РСІ, як сэкцыі РСІ, ВКК, шэфства і г. д. кожная ў паасобку патрабуе не агульнага падыходу, агульных разважаньняў, а канкрэтнага кіраўніцтва данай групай, якая ўдзельнічае ў рабоце РСІ. Скліканьне нарад, інструкцыйных гутаркі з актывам, забесьпячэньне актыву інструкцыйнымі матар'яламі, асьвятленьне практыкі работы лепшых уёораў і памылак праз друк, у прыватнасьці ў «Лістках РСІ», — спаборніцтва мас у гэтай справе на лепшы бок — вось віды арганізацыйнай работы ў гэтай галіне.

Нашу работу па ўдзяленьні мас трэба пранізаць самакрытыкай, яна ў органах РСІ часта не падпараджкуецца належнай праверды, ацэнцы. Правяла РСІ налёт, масавую праверку, шэфскія арганізацыі маюць якуюсьці практыку ў рабоце, а вось праверыць, выявіць недахваты, як лепш справу паставіць, самакрытыку арганізаваць, — мы ня ўмеем або не пасьпяваем. Часта добраахвотнікі-актывісты РСІ ў сваёй рабоце ідуць вобмакам, умелая практыка адных не перадаецца другім. Тут у органах РСІ пануе так званы **«самацёк».**

У арганізацыйным кіраўніцтве актывам ЦКК-РСІ СССР мае пэўную практыку, якою трэба карыстацца мясцом. Частае скліканьне нарад розных груп актыву значна дапамагае правільнай арганізацыі мас (нарады добраахвотнікаў па шэфстве, актыву груп «лёгкай кавалерыі» і г. д.). Некаторыя КК-РСІ надаюць гэтай справе настолькі сур'ёзнае значэньне, што выначаюць у бліжайшы час скліканьне краявых нарад па масавай рабоце РСІ (Сярэдня-Волская КК і інш.) з прыцягненьнем нізавых масавых арганізацый — сэкцый РСІ, рабочых брыгад прадпрыемстваў, якія сябе праявілі. Зьлёты «лёгкай кавалерыі», правялікае значэньне для паляпшэньня прыцягненьня камсамолу ў барацьбу з бюракратызмам.

У ліку іншых форм кіраўніцтва актывам РСІ трэба адзначыць практыку месц у выданьні спецыяльных перыядычных лісткоў «у дапамогу актывістаму РСІ». Патрэба ў такіх выданьнях зусім насьпела, бо непасрэдна жывое інструктаваньне і агульны друк ня могуць ахапіць усіх пытаньняў і даталяй кіраўніцтва актывам РСІ. Прыцягнутыя часта ставяць на нарадах пытаньні аб тым, што ім трэба сыстэматычна знаёміцца з дзелавой практыкай другіх, ім трэба дапамагаць мэтадычнымі ўказаньнямі, парадамі.

Перад намі два такія пачынаньні на мясцох: «Ильичевский Рабкрин» — штомесячны бюлетэнь рабочага актыву Сярэдня-Волскай краявой РСІ (Самара) і «Пролетарский Контроль» — лісток-бюлетэнь Паўночна-Каўкаскай краявой РСІ (Растоў). Першы выдаецца ўжо на працягу некалькіх месяцаў, у фармаце газэтнага паўаркушу малога фармату, другі — у форме невялікай брашуры, выпуш першым нумарам, тыраж абодвух па тысячы экэмпляраў. У бюлетэнях даецца матар'ял, які асьвятляе работу групы садзейнасьці РСІ на прадпрыемствах, даведамленьні з месц аб рабоце «Лёгкай кавалерыі РСІ». «Ильичевский Рабкрин» у адзделе «в блокнот активисту РКИ» дае такія інструкцыйныя матар'ялы, як памятка абсьледвальніка бюро скаргаў, паказаньні аб тым, як улічваць работу груп садзейнасьці РСІ (дзеньнік уліку работы), што павінна ведаць група актыву РСІ і г. д.

«Пролетарский Контроль» (Растоў-на-Доне) ужо мае групу карэспандэнцый з месц аб рабоце сэкцый РСІ, ВКК, у ім дадзена некалькі прапаноў актывістых аб паляпшэньні работы бюро скаргаў, аб арганізацыі праверкі выкананьня. Там-жа даведамляецца аб новых мерапрыемствах РСІ, аб курсах-сэмінарах для актывістых, якія арганізоўваюцца краявым бюро скаргаў. Бюлетэнь разгортвае і крытыку асобных недахопаў РСІ і груп садзейнасьці, напрыклад, аб «галавацянскіх тройках «лёгкай кавалерыі», як ня трэба весьці работу з актывамі — у бюро скаргаў П.-Каўкаск. РСІ. У сваёй перадавой «Пролетарский Контроль» правільна ставіць задачу, побач з асьвятленьнем задач РСІ, абмеркам практыкай — падштурхаць РСІ, якія дрэнна працуюць, тых, хто нядольны быць арганізатарам мас і сваёй нядольнасьцю адштурхвае ад сябе той актыў, які хоча нам дапамагаць.

Гэта практыка месц ставіць таксама пытаньне аб патрэбнасьці выданьня маса**вай часопісі ЦКК-РСІ для шырокага актыву РСІ,** у якой распачатую месцамі справу можна было-б разгарнуць шырока, з падагульненьнем усяго практыкі РСІ, з пастаноўкай асьвятленьня мэтадаў работы і інструктажу для актыву. Подыт на такога роду выданьне настолькі ясны, што асобныя РСІ ўжо робяць заяўкі на пэўную колькасьць нізавых падпісчыкаў. Паміма актыву і работнікаў РСІ, апошняя праз такую часопісь можна пырока зьвязацца з вясковым вуласактыў, якія чакаюць ад нас сыстэматычнага інструктажу і кіраўніцтва.

Паставіць на цьвёрдую і моцную асобую справу арганізацыі мас наўкола рабоча-селянскай інспэкцыі, выхаваньня іх у духу правільных мэтадаў масавага кантролю — вось задачы органаў РСІ.

А. ВІНАГРАДАЎ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Ні аднаго партыйца і камсамольца па-за ўдарнымі брыгадамі

Бязьлітасна выкрывайце камуністых-„хвосьцікаў“--дэзэртыраў з працоўнага фронту

Выраўняць фронт

Кожны партыйны калектыў павінен стаць арганізатарам барацьбы за прамфінплян — такая баявая катэгарычная дырэктыва партыі. Аднак, ня гледзячы на гэту дырэктыву, ёсьць яшчэ такія партарганізацыі, якія плятуцца ў хвасьце творчага ўздыму рабочай масы і зусім слаба мабілізаваны на барацьбу за ліквідацыю прарываў на вытворчым фронце.

Факты з практыкі асобных гомельскіх партарганізацый зьяўляюцца лепшымі сьведкамі ў гэтым напрамку. Тут замест упартай барацьбы за прамфінплян мы маем недапушчальнае ігнараваньне пытаньняў вытворчасьці (ячэйка заводу **«Сацыялізм»**), адмову членаў партыі прымаць удзел у сацыялістычным спаборніцтве (ф-ка **«Праца»**), бязьдзейнасьць замест барацьбы са шкодніцтвам (парткалектыў ф-кі **«Вэзуві»**) і г. д.

Бясспрэчна, што пры такім стане работы немагчыма мабілізацыя партыйнай масы (і беспартыйнай) на выкананьне прамфінплану, зразумела, што гэтыя парткалёктывы нядольны стаць на чале барацьбы за прамфінплян пры такіх марудных і недапушчальных тэмпах сваёй дзейнасьці.

Толькі тым, што асобныя вытворныя партарганізацыі, замест рашучай бальшавіцкай перабудовы партыйнай і масавай работы ў адпаведнасьці з новымі тэмпамі і задачамі, плятуцца ў хвасьце і знаходзяцца ў палоне старых форм і мэтадаў работы, трэба тлумачыць зрывы плянавых заданьняў.

Асобныя таварыщы ў радах партарганізацыі настойліва шукаюць прычын зрыву прамфінплану ў «аб'ектыўных» прычынах, скочваючыся ў радзе выпадкаў на рэйкі апартунізму.

Толькі апартуністычным можна назваць выступленьне сакратара парткалектыву **швэйнай фабрыкі (Магілеў)**, які даводзіў, што прамфінплян будзе выкананы толькі тады, «калі мы будзем менш пасылаць рабочых на вёску».

Па такіх разважаньнях трэба біць з усёй непрымірымасьцю. Кожная вытворчая парт'ячэйка павінна бездакладна на справе выканаць дырэктыву партыі аб ліквідацыі гаспадарчых прарываў і неправыкананьні прамфінплянаў. 100 проц. камуністых і камсамольцаў на ўдарных брыгадах! Камуністы і камсамолец на вытворчасьці павінны паказаць ударныя рэвалюцыйныя тэмпы работы — гэтыя лёзунгі павінны быць **выкананы** ў кожнай ячэйцы на кожным прадпрыемстве ва што-б там ні стала.

Ленінскі набор у КП(б)Б

245 рабочых заводу „Чырвоны Мэталісты“ падалі заявы аб прыёме ў рады партыі

Па ГОМЕЛІ ленінскі набор разгортваецца з яшчэ большай сілай. Старыя высока-кваліфікаваныя рабочыя на заводах і фабрыках Гомелю калентыўна падаюць заявы аб уступленьні ў рады КП(б)Б.

На швэйнай фабрыцы «КАМІНТЭРН» 83 рабочыя падалі заявы аб прыёме ў партыю. Усе падаўшыя маюць вытворчы стаж ад 10 да 30 год.

У партыйную ячэйку заводу «МЭТАЛІСТЫ» падалі заявы 2 рабочыя з 30-гадовым вытворчым стажам, 4 рабочыя з 25-гадовым рабочым стажам і 12 рабочых з 10-гадовым вытворчым стажам.

На абутковай фабрыцы «ПРАЦА» 33 рабочыя падалі заявы аб прыёме ў рады КП(б)Б. Заяву аб уступленьні ў партыю падаў таксама рабочы БАСАЎ, які 60 год працуе на вытворчасьці.

На МЭБЛЕВАЙ фабрыцы 16 рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю. Большасьць рабочых ня менш 30-ці год працуе на вытворчасьці.

У ячэйку «ВОДОСВЕТА» 10 рабочых ад варштату падалі заявы. Падаў заяву рабочы ад варштату т. АСТРАВЕНЕЦ, які мае 45-гадовы вытворчы стаж.

Гарадзкі раённы камітэт партыі гэтымі дняміі склікае сход т.т., якія падалі заявы аб уступленьні ў партыю. На сходзе будуць абмяркаваны пытаньні аб кіраўнічай ролі партыі ў сацыялістычным будаўніцтве і разгортваньні грамадзкай работы і агульна-асьветнай і палітычнай вучобы сярод рабочых, якія ўступілі ў ленінскі заклік у рады партыі.

Паводле далёка няпоўных вестак у ЗАЛІНЕЙНЫМ раёне (Гомель) у ленінскі заклік 97 рабочых ад варштату заводу імя ЛАНЦУЦКАГА падалі заявы аб уступленьні ў КП(б)Б. У ЧЫГУНАЧНАЙ майстарні падана 9 заяў ад рабочых ад варштату; на станцыі Гомель — 4; на станцыі Гомель гас. чыг. — 5; у парт'ячэйку грузчыкаў падана 7 заяў; у ячэйку будаўнікоў — 7; у ячэйку майстрань тэлеграфу — 3 і г. д. 57 рабочых чыгуначнікаў, якія працуюць на 9-м вучастку цягі, падалі заявы аб уступленьні ў КП(б)Б. Прыцёк заяў ня спыняецца. З кожным днём ячэйкі атрымліваюць дзесяткі заяў аб прыёме ў партыю ад старых, высока-кваліфікаваных рабочых і работніц вытворчасьці.

Залінейны райком партыі арганізаваў скарочаныя палітшколы для рабочых і работніц, падаўшых заявы аб прыёме ў партыю.

Ленінскі заклік даў новыя дзесяткі рабочых і работніц ад варштату АРШАНСКАЙ акруговай партарганізацыі.

На заводзе «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» 42 рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю. Завод збяжыцца сябе ўдарным. На Аршанскім ЧЫГУНАЧНЫМ вузле 67 рабочых падалі заявы аб прыёме ў КП(б)Б. На АСІНБУДЗЕ ў ленінскія дні падана звыш 30 заяў ад рабочых і 2 ад навгасьнікаў-беднякоў.

Па акрузе, у сувязі з ленінскім заклікам, заўважаецца масавае імкненьне батракоў, с.-г. рабочых і перадавых беднякоў-калгасьнікаў да ўступленьня ў рады партыі. КАМУНАРЫ І РАБОЧЫЯ САЎГАСУ «ВУСЬЦЕ» ПАДАЛІ КАЛЕКТЫЎНУЮ ЗАЯВУ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў ПАРТЫЮ. Сярод падаўшых ёсьць 6 жанчын-работніц. У Ярошкаўскім сельсавеце ПАДАЛІ заявы аб прыёме ў партыю 16 КАМУНАРАЎ новаарганізаванай камуны, у калгасе «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» падалі заявы аб уступленьні ў партыю 3 сялян-беднякоў і г. д., і г. д.

***

20 рабочых ад варштату на заводзе «ЗЬВЯЗДА» (Мазырышчыне) у ленінскія дні падалі заявы аб прыёме ў партыю.

***

Абутковая фабрыка імя ЛЕКЕРТА (Віцебск) абвясьціла сябе ўдарнай. ЗАКРОЙНЫ цэх цалкам падаў заяву аб уступленьні ў рады КП(б)Б. У закройным цэху працуе 70 рабочых, большасьць якіх мае вытворчы стаж ад 25 да 35 год. У ЗАГАТОВАЧНЫМ цэху рабочыя-машыністы арганізавалі ўдарную камуну і калектыўна падалі заяву аб уступленьні ў КП(б)Б. АДДЗЕЛАЧНЫ цэх падаў калектыўную заяву аб уступленьні ў партыю. Старыя кваліфікаваныя рабочыя ў масавым разьмеры вынікаюць расцэнкі і павялічваюць нормы выпрацоўкі. Паводле зусім няпоўных вестак, на фабрыцы падана ўжо каля 300 заяў ад рабочых і работніц—ад варштату аб уступленьні ў партыю.

Сон на баявым пасту

Асноўныя прадпрыемствы **Гомеля** ня выканалі прамфінплану ў першым квартале. Студзень таксама ня даў відавочнага пералому. Бясспрэчна, адзэй з асноўных прычын недавыкананьня плянавых заданьняў зьяўляюцца зусім павольныя і марудныя тэмпы перабудовы партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай работы на прадпрыемствах. Партыйныя ячэйкі яшчэ далёка ня сталі арганізатарамі барацьбы за прамфінплян і ў радзе выпадкаў плятуцца ў хвасьце творчага ўздыму рабочае масы.

Парт'ячэйка заводу **«Сацыялізм»**, як паказала чыстка, зусім ня цікавілася гаспадарчым жыцьцём прадпрыемства. Практычная работа ячэйкі паставлена нездавальняюча. Ніякага кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі з боку партыйнай ячэйкі ня было. У выніку першы гаспадарча-палітычны дагавор у сваіх асноўных паказальніках ня выкананы. Прамфінплян у першым квартале недавыкананы. Ясна, што кіраўніцтва ячэйкі праводзіла апартуністычную лінію, не мабілізуючы камуністых і беспартыйных рабочых на ўдартную барацьбу за прамфінплян.

На жаль, сумная практыка партыйнай ячэйкі заводу «Сацыялізм» не зьяўляецца адзінай. На іншых асобных заводах партыйныя ячэйкі таксама недапушчальна і ганебна адстаюць у барацьбе за прамфінплян. Далёка ня ўсе члены партыі на фабрыцы **«Праца»** зьяўляюцца ўдарнікамі сацыялістычнага спаборніцтва. Значная частка камуністых ня ўступіла ва ўдарныя брыгады. Паводле матар'ялаў чысткі відаць, што ячэйка ня кіруе сацыялістычным спаборніцтвам на прадпрыемстве. Цэх. партарганізатары ў цэхах бязьдзейнічаюць і не праводзяць ніякай прапагандысцкай работы. Беспартыйныя рабочыя значна лепш і больш уважліва адносяцца да вытворчасьці, чым цэхавыя партарганізатары. Зусім відавочна, што пры такім стане партыйнай работы ў цэхах на фабрыцы маюць месца буйныя гаспадарчыя прарывы.

На фабрыцы **«Вэзуві»** за апошнія дні выкрыты факты шкодніцтва. На фабрыцы пагражаюча растуць прагулы. Кожны дзень ня выходзіць на работу звыш 100 рабочых і работніц. Гас падарча-палітычны дагавор ня выкананы. Партыйная арганізацыя фабрыкі нерашуча рэагуе на гэтыя ганебныя факты і зусім нездавальняюча змагаецца за прамфінплян. Парткіраўніцтва фабрыкі не мабілізавала арганізацыю на барацьбу з камуністымі-«хвосьцікамі», якіх, на жаль, яшчэ многа на фабрыцы. Аб гэтым сьведчыць той факт, што адміністрацыя фабрыкі пакарала 20 партыйцаў па адміністрацыйнай лініі за сымуляцыю і нядбайныя адносіны да вытворчасьці.

Гэтыя факты сыгналізуюць, што кіраўніцтвы партарганізацый вышэй паказаных прадпрыемстваў сьпяць на сваім баявым і адказным пасту. Трэба безадкладна разбурыць партыйнае кіраўніцтва гэтых заводаў і фабрык. Парт'ячэйкі павінны, не марнуючы ні адзінай мінуты, рашуча выкрываць дапушчальныя памылкі і прарывы на вытворчым фронце.

Рвачы з партбілетамі

На прадпрыемстве ні аднэй ударнай брыгады

**Партыйная ячэйка гарбароў (Ворша) нічога ня робіць па барацьбе за выкананьне прамфінплану. Сацыялістычным спаборніцтвам партыйная ячэйка зусім ня кіруе. На прадпрыемстве ўдарныя брыгады ня створаны. Частка камуністых адмаўляецца ўступіць ва ўдарныя брыгады і зьяўляецца рвачамі і хвасьцістымі. Партыйцы ШКЛЯР І СУХАРЭНКА адкрыта выступілі на сходзе з рэакцыкі запатрабавань

Хворы трактар--удар па калектывізацыі

Гомельскі завод імя Ланцуцкага не нагружаны.

Саўгасы і калгасы марудзяць з дастаўкаю машын

ДА ГАНЕБНАГА СЛУПА ТЫХ, ХТО ЗРЫВАЕ РАМОНТ ТРАКТАРАЎ І с.-г. МАШЫН

ІНІЦЫЯТЫВА РАБОЧЫХ ЗАХАВАНА Ў КАНЦЫЛЯРСКІХ ПАПЕРАХ

Рабочыя Гомельскага вагонна-рамонтнага заводу жыва і энэргічна падхапілі ўзьнятае на старонках нашага друку пытаньне аб максымальным скарыстань ні чыгуначных заводаў і майстэрань для рамонту с.-г. машын і трактараў. Завод абвясьціў сябе ўдарным. Але ініцыятыва рабочых была захавана ў канцылярскіх паперах. Пачалася бюракратычная перапіска аб пасеўнай кампаніі. У канцылярскіх нетрах зьявіліся «тэрміновыя» паперы з спэцыяльнымі адзнакамі «пасеўная». Яшчэ 24-га сьнеж ня Гомельскі АВК і акраэ атрымалі ад НКШЗ і НКЗ Саюзу тэлеграму з копіяй заводу наступнага зьместу:

«Немедленно максимально использовать в порядке догрузки гомельские ж.-д. мастерские по ремонту с.-х. машин к весенней посевной кампании».

Але толькі праз 10 дзён на завод зьявіўся прадстаўнік акраэ і дагаварыўся з заводзкімі арганізацыямі прысьлаць заводу для капітальнага рамонту 12-14 трактараў і розныя с.-г. машыны. Завод запэўніў прадстаўніка акраэ, што пры сваячасовай прысылцы гэтых машын яны будуць ва ўдарным парадку адрамантаваны яшчэ да пачатку веснавое сяўбы.

Што-ж выйшла на самой справе. З-за галавацтва работнікаў акраэ і інш. с.-г. арганізацый, Гомельскі завод абяцаных трактараў і с.-г. машын да канца студзеня і ў вочы ня бачыў.

Толькі 27-га студзеня на завод паступілі для рамонту два трактары і 12 разных с.-г. машын.

28-га студзеня на завод паступілі яшчэ два трактары. І ўсё. Гэта толькі ад 3-х саўгасаў, ад калгасаў-жа не дастаўлена ні аднаэ машыны.

Абурэючы ганебны факт. Саўгас, які знаходзіцца ад Гомелю на адлегласьці 6 кілём., ня гледзячы на тры прапановы, не даставіў для рамонту ні аднаго трактара. Чаму? Аказваецца, як аб гэтым заявіў спэцыяліст акраэ, саўгас толькі зараз на трактарах пачаў малаціць.

Цікава, чаму-ж тады не паступаюць для рамонту сяўкрці і плугі, якімі цяпер не аруць і ня сеюць. Характэрна, што некаторыя калгасы проста чамусьці ня хочуць аддаваць для рамонту свае с.-г. машыны.

Усе машыны акраэ дастаўляе на завод ня партыямі, як аб гэтым было дагаворана, а па аднэй і самае галоўнае бяз жаднага апісаньня таго, што трэба рамантаваць. Не паказваецца, якіх частак у машыне не хапае.

Аднак, завод бяз усякага дагавору і пры такіх умовах не адмаўляе—бярэ і рамантуе.

Урэшце, завод у сувязі з яго недагрузкай мае магчымасьць адрамантаваць куды большую колькасьць трактараў. Можна было-б даставіць на завод шмат с.-г. машын з іншых округ, што мяжуюцца з Гомельшчынай. Але аб гэтым ніхто не паклапаціўся.

Брыгадзір «Зьвязды» ПЯЧОНКА.

За нядбайныя адносіны да допісу—зьняць з работы

Нядаўна ў газэце «Беларуская Вёска» была зьмешчана заметка, у якой пісалася аб нядбайнасьці і бюракратызьме, дапушчаных пры расьсьледваньні допісу аб безгаспадарчасьці ў Рыпаўскай малочнай арцелі «Яднаньне».

Расьсьледваньнем Мен. АКК-РСІ устаноўлена, што інструктар Белмалжывёлсаюзу тав. **Радкевіч**, якому было даручана расьсьледаваць факты, **згубіў допіс і нават пічыў, што нічога сур'ёзнага ў гэтым допісе ня было.**

На аб'яднаным пасяджэньні прэзыдыуму і калегіі РСІ, дзе разглядзана гэтае пытаньне, пастаноўлена за нядбайныя адносіны да расьсьледваньні) **інструктара Радкевіча зьняць з работы.** Ц—н.

ПЕРАВЫБАРЫ СЕЛЬСАВЕТАЎ, ЯКІЯ НЯЗДОЛЬНЫ БЫЦЬ НАЧАЛЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

ГОМЕЛЬ (наш кар.). Гомельскі РВК праводзіць азнаямленьне з работай сельсаветаў раёну і з іх дзейнасьцю ў галіне калектывізацыі. РВК пастанавіў датэрмінова перавыбраць 14 непраздольных сельсаветаў.

Пасьля двухмесячнай цяганіны...

Белсельгасснабам падпісаны, нарэшце, пасьля двухмесячнай цяганіны дагавор з параноза-рамонтным заводам імя Ланцуцкага ў Гомелі на выраб запасных частак для трактараў на суму 300.000 руб. Дагавор прадугледжвае выпуск некалькіх дзесяткаў тысяч штук запасных частак ня толькі для патрэб БССР, але і СССР.

Прадстаўнікі заводу імя Ланцуцкага выехалі на Пуцілаўскі і іншыя заводы для атрыманьня мадэляй і чарцяжоў трактарных запасных частак.

НКЗ БССР зьвярнуўся да НКЗ СССР з хадайніцтвам аб аказаньні дапамогі ў атрыманьні ад галоўмашынстрою двух вагонаў чыгуну і аднаго вагону нікелевай сталі.

Гомельскі завод вызначаецца рамонтна-трактарнай базай для Гомельскай і Магілёўскай округ. Па гэтых дзьвёх округах трэба адрамантаваць ня менш 25 трактараў.

Наркамзем накіраваў у округі інструктараў па тэхнічнай дапамозе і праверцы падрыхтаванасьці чыгуначных майстэрань і наогул майстэрань для рамонту с.-г. машын.

Ня гледзячы на заключэньне генэральнага дагавору з заводам імя Ланцуцкага, акрэмаддзелы і калгассаюзы усё яшчэ марудзяць з дачай заказаў. Дагэтуль на завод паступіла для рамонтаў усяго некалькі трактараў.

У НКЗ БССР зусім невядома, што-ж робіцца на мясцох з іншымі чыгуначнымі майстэрнямі.

Як ужо ў нас паведамлялася, па Беларусі 11 чыгуначных майстэрань павінны пераключыць частку сваёй работы на рамонт с.-г. машын і выраб запасных частак. **Па БССР патрабуюць рамонту звыш 150 трактараў.** Калі-б зямельныя органы сваячасова ўзяліся за справу, то да красавіка можна было-б адрамантаваць значную колькасьць машын.

Аднак, патрэбнага эруху ў гэтай справе ўсё яшчэ няма. Зусім невядома, як падрыхтаваны да рамонту с.-г. інвэнтару майстэрні ў такіх буйных пунктах, як Ворша, Віцебск і г. д.

Рабочыя-масы не мабілізаваны заколгэтага важнага пытаньня. Вельмі дрэнна абстаіць справа з забесьпячэньнем майстэрань жалезам. Упоўнаважаны па пасеўнай кампаніі т. Рачыцкі ўжо даў загад аб тым, каб усё жалеза, якое вызначана для шырокага рынку, было накіравана ў с.-г. майстэрні. Рудмэтальгандлю прапанавана выдзяліць 200 тон мэталю.

Час ня церпіць. **Упоўнаважанаму НКШЗ, прафсаюзу чыгуначнікаў, НКЗ** трэба безадкладна праверыць, як выконваецца дырэктыва Наркамзему СССР, НКШЗ і ЦК саюзу чыгуначнікаў аб пераводзе чыгуначных майстэрань на рамонт с.-г. інвэнтару і выраб запасных частак.

М. К.

Толькі пасьля ўмяшаньня РСІ

Менская акруговая зямельная кіраўніцтва і чыгуначная майстэрня МБВ чы гунні ніяк ня могуць дагаварыцца паміж сабою аб рамонце і падладжаньні сельска-гаспадарчых машын і плугоў і інш.

Ужо некалькі тыдняў гэтае пытаньне ўсё абгаварваецца на нарадах, пасяджэньнях, а дагаварыцца ніяк ня могуць.

У чым-жа справа?

Майстэрня патрабуе сьпісу машын, плугоў і інш., якія падлягаюць рамонту, а зямельнае кіраўніцтва ня мае ўліку сельска-гаспадарчых машын па калгасах і саўгасах. Майстэрня таксама патрабуе не індывідуальнага разьліку з кожным калгасам і саўгасам, а—з акруговым зямельным кіраўніцтвам.

Толькі пасьля ўмяшаньня ў гэту справу прадстаўніка НК РСІ Беларусі т. Ратайка дагавор 13 лютага быў заключаны і майстэрня прыступіла да рамонту розных сельска-гаспадарчых машын.

Трэба рашуча ўдарыць па сялдбайных адносінах да пасеўкампаніі і да рамонту патрэбных машын.

А. Фальдзэнка.



ЗЛАЧЫННАЯ НЯДБАЙНАСЬЦЬ БЕЛПАЙГАНДЛЮ І БЕЛКААПСАЮЗУ

Справа арганізацыі рамонтных майстэрань у калгасах знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Да гэтага часу адсутнічае патрэбнае абсталяваньне для арганізацыі с.-г. рамонтных майстэрань.

Згодна пастановы саюзнага ўраду, у гэтым годзе забесьпячэньне інструментам для абсталяваньня с.-г. рамонтных майстэрань павінна ісьці па лініі спажывецкай кааперацыі і гандлёвых арганізацый. Трэба адзначыць, што ні адна з гандлёвых арганізацый, у тым ліку беларуская кантора «ВМС», не заціканіліся гэтай справай і ня ўлічылі патрэбы сацыялістычнага сэктару ў абсталяваньні для рамонтных майстэрань.

Усе гэтыя арганізацыі сваячасова не падалі ў саюзныя цэнтры патрэбнае заяўкі на неабходнае абсталяваньне для рамонтных майстэрань і таму для БССР сваячасова ня было вызначана абсталяваньне ў патрэбнай колькасьці.

Старшыня праўленьня Белсельгасснабу тав. Талапіла месяц таму назад паставіў перад Наркамгандлем гэтае пытаньне. Было запрапанавана Белпайгандлю, Белкаапсаюзу і беларускай канторы «ВМС» прыняць тэрміновыя меры да забесьпячэньня рамонтных майстэрань патрэбным абсталяваньнем і інструментам.

Учора на спэцыяльным пасяджэньні было вясьветлена, што **ні Белкаапсаюз, ні Белпайгандаль** да гэтага часу нічога не зрабілі для забесьпячэньня рамонтных майстэрань патрэбным абсталяваньнем.

Нарада пастанавіла прасіць пракуратуру расьсьледваць справу і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зрыве забесьпячэньня с.-г. майстэрань патрэбным інструментам.

Белсельгасснабу і Белсельтрэсту запрапанавана ў 24 гадзіны ўдакладніць заяўкі на патрэбнае абсталяваньне і разьмеркаваць іх паміж Белпайгандлем і Белкаапсаюзам. Пастаноўлена прасіць ВСНГ выдзеліць магчымую колькасьць інструментаў з заводаў беларускае прамысловасьці.

Што датычыць арганізацыі буйных рамонтных майстэрань, якія павінны быць пабудаваны на лініі ВСНГ, **дык гэта дырэктыва ўжо два гады ня выконваецца.** Да пабудовы гэтых майстэрань яшчэ не прыступлена.

Для арганізаваных сёлета 12-ці спэцыяльных майстэрань па рамонце трактараў абсталяваньне закуплена ў Амэрыцы і ў канцы лютага яно павінна быць адгружана.

Белпайгандаль і Белкаапсаюз павінны прыняць тэрміновыя меры да хутчэйшага забесьпячэньня рамонтных майстэрань патрэбным абсталяваньнем, бо інакш справа рамонту с.-г. інвэнтару стаіць пад пагрозай зрыву.

У Дрысе чамусьці адкладваюць раскулачваньне

Калектывізацыя ў Дрысенскім раёне праведзена на 90 проц., але раскулачваньне праходзіць надзвычайна марудна. Напрыклад, у Серцянскім сельсавеце адна вёска калектывізавана на 100 проц., а кулакі ўсё яшчэ сядзяць на сваіх мясцох. Маемасьць іх не канфіскавана, ня гледзячы на запатрабаваньні беднякоў і сераднякоў гэтага раёну. З прычыны такое палітычнае блізарукасьці РВК, кулацтва ходзіць па хатах і вядзе агітацыю супроць калектывізацыі.

У **Жоўніцкім** сельсавеце калектывізацыя праведзена на 100 проц. Не найшлі ў калгас толькі дзьве гаспадаркі з вёскі Марцэлава, у тым ліку член КП(б)Б Саўчанка. Бацька Саўчанкі—першы агітатар супроць калектывізацыі, ён зьяўляецца рупарам кулакоў. Саўчанка ня раз зрываў сходы на калектывізацыі.

Саўчанка—сын, член партыі, гаворыць на сходах сялян, што ён пойдзе ў калгас толькі тады, калі будзе ўстаноўлены «пай на сдаку».

Праз агітацыю кулакоў—прыхільнікаў Саўчанка — калектывізацыя ў вёсцы Марцэлаўка праходзіць вельмі марудна. Там зараз распродваецца жывёла і ніхто з гэтым не вядзе ніякай барацьбы.

Брыгадзір «Зьвязды» ХАЛЯВІН.

Месячнік ашчаднасьці

РЭАЛЬНЫХ ВЫНІКАЎ ПАКУЛЬ НЯМА

Камісіі садзейнічаньня зусім не займаюцца ашчаднаю справаю

Месячнік ня вышаў за парог габінэтаў

На Магілеўшчыне наглядаецца адліў укладаў

(На пасяджэньні цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту)

13-га лютага адбылося пасяджэньне цэнтральнае камісіі па садзейнічаньні дзяржкрэдыту з удзелам брыгады Маскоўскага электразаводу. На пасяджэньні заслуханы даклады Белдзяржкіно, Магілёўскае акруговае камісіі аб падрыхтоўцы і правядзеньні месячніка ашчаднасьці.

Белдзяржкіно да гэтага часу абмежавалася ў папулярызацыі задач месячніка ашчаднасьці толькі дэманстраваньнем на экранах менскіх кіно трох лёзунгаў. Як высьветлілася, лёзунгі, паданыя Белдзяржкіно ў округі, як у гарадзкіх, так і ў вясковых кіно яшчэ не дэманструюцца. Камісія прапанавала Белдзяржкіно неадкладна правесьці сур'ёзную і глыбокую агітацыйную работу, скрыстаўшы для гэтага ўсе кіно і тэатры БССР.

З дакладу Магілеўскае акруговае камісіі садзейнічаньня і дзяржкрэдыту высьветлілася, што камісія да гэтага часу фактычна не працавала. Толькі 12 лютага адбылося першае пасяджэньне камісіі.

Акруговыя праўленьні саюзаў Магілеўшчыны абмежаваліся рассылкаю на месцы дырэктывы. Фактычна прафсаюзы нічога не зрабілі як па арганізацыі падрыхтоўчае работы, так і па мабілізацыі прафсаюзных мас на пасьпяховае правядзеньне месячніка. Работа прафсаюзаў фактычна ня вышла а габінэтаў.

У частках акруговых працаўнікоў ёсьць нядобрыя настрої: «месячнік з посьпехам ня можа прайсьці, бо Магілеўшчына абвешчана акругаю суцэльнае калектывізацыі, а таму... шмат работы і няма часу займацца месячнікамі».

У рабоце адсутнічае ўязка і належная плянавасьць: напрыклад, выяжджаючыя на вёску па пытаньнях калектывізацыі працаўнікі ўпарта адмаўляюць да праводзіць работу па месячніку ашчаднасьці.

У той час, калі ў горадзе ўсё-ж праведзена некаторая растлумачальная работа, дык у вёсцы становішча зусім дрэннае. Ні райкомы партыі, ні райвыканкомы яшчэ не прыступілі да практычнага правядзеньня месячніка. **Справа далей «распрацоўкі, «абгадменьняў» не пайшла. Ва ўсёй Магілеўскай акрузе няма ніводнае касы ашчаднасьці ў калгасах.**

У выніку зусім дрэннае падрыхтоўкі і правядзеньня месячніка, на акрузе замест прыпёку укладаў назіраецца значны адліў.

За студзень уклады ў ашчадкасах Магілеўшчыны зьменшыліся на 128.000 руб., у тым ліку на сялянскіх укладах—на 18.000 руб. За першую дэсяціднёўку лютага адліў укладаў выявіўся ў суме 56.000 руб.

Бязьдзейнасьць грае на руку кулаку

ВОРША (наш кар.). Месячнік ашчаднасьці на Аршаншчыне даў пакуль што толькі 246 новых укладчыкаў.

Па некаторых раёнах месячнік ашчаднасьці зусім яшчэ не распачынаўся. Савецкія і грамадзкія арганізацыі бязьдзейнічаюць, гэтым карыстаецца кулак, які распускае чуткі, што быццам-бы хутка грошы будуць ліквідаваны, і агітуе сялянства забіраць свае ўклады з кас ашчаднасьці.

Лепш пастаўлена работа па месячніку ашчаднасьці ў горадзе Воршы. За 5 дзён у касы ашчаднасьці ўступілі ўкладчыкамі 244 чал. з сумаю ўкладаў у 2.016 руб.

Трэба падцягнуцца адсталым раёнам. У процілеглым выпадку месячнік можа сарвацца. И.

Не пайшлі далей агульных дырэктыў

Цэнтральныя праўленьні прафсаюзаў яшчэ займаюцца „меркаваньнямі"

Рабочая брыгада маскоўскага электразаводу наведала цэнтральныя праўленьні прафсаюзаў мэталістых, харчавікоў і гарбароў, каб праверыць удзел саюзаў у месячніку ашчаднасьці.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам брыгада адзначыла: «нашае агульнае ўражаньне, што прафсаюзы прымаюць вельмі слабы ўдзел у месячніку».

ЦП саюзу харчавікоў абмежавалася вынясьненьнем агульнай пастановы і ніякіх практычных мерапрыемстваў не зрабіла. Працаўнікі ЦП маркуюць разгарнуць кампанію толькі з 15-га лютага.

Яшчэ горшае становішча ў ЦП саюзу гарбароў: нам, старшыні ЦП вельмі дрэнна ўявіў сабе задачы кампаніі і тлумачыць **бязьдзейнасьць ЦП** перагрузкай і інш. «абгаворнымі прычынамі».

Саюз мэталістых у пачатку месячніка даў дырэктывы мясцовым арганізацыям і склікае нараду фабзаўкомаў, каб шырока разгарнуць кампанію.

*
*

Абсьледваньне 1-га гарадзкога аддзяленьня Менскай акруговай касы ашчаднасьці яшчэ раз пацьвярджае ўражаньне маскоўскай брыгады, што месячнік на горадзе Менску значна спазьніўся. За першыя 10 дзён сабрана ўсяго толькі 2.000 руб. укладаў і прыцягнута 115 новых укладчыкаў. Б.

Адзін новы ўкладчык!

ЧЭРВЕНЬ (наш кар.). Адзін ашчадных кас па Чэрвеншчыне бязьдзейнічае. Месячнік ашчаднасьці замест 1-га распачаўся толькі 5-га лютага. Да практычнай работы па правядзеньні месячніка яшчэ ня прыступілі.

Да апошняга часу не праведзена ні аднаго выезду ў сельсаветы. Зусім ня склікаліся сходы гарадзкога насельніцтва, не праводзіліся нарады актыву. Агітацыйнага матар'ялу няма. Акруговая ашчаднаса прысылае 5-ю плякатаў і некалькі лёзунгаў. У суме і з такою бязьдзейнасьцю, пастуючыя ўкладаў у касы ашчаднасьці ўсё вызначае. ПА ЎСІМ РАЁНЕ Ў КЛУБ АШЧАДНАСЬЦІ ЎЦЯГНУТЫ ТОЛЬКІ АДЗІН УКЛАДЧЫК.

Бабруйскі камбінат яшчэ не забясьпечаны сыравінай

Дастаўка лесаматар'ялаў ідзе дрэнна

БАБРУЙСК. (Па тэл. ад спэцкора газ. «РАБОЧИЙ»). Становішча на Бабруйскім лесакамбінаце ўсё яшчэ пагражаючае. Дастаўка лесаматар'ялу ідзе слаба. Прарабы не даюць чыгунцы заявак на патрэбную колькасьць вагонаў і пляцформаў, а потым узваль ваюць усю віну на рабочых чыгункі. Працягваецца самая агідная канкурэнцыя на лесазагатоўчых вучастках.

Для выяўленьня прычын аварыі на лесазаводзе № 7 была створана спэцыяльная камісія. Камісія выявіла, што скрынка цыліндру лёкамабілю разбіта ў некалькіх мясцох. Зусім разьбіты поршэнь.

Выявіць дасканалую прычыну аварыі пакуль не ўдалося. Камісія лічыць, што прычыны аварыі — тэрмічнага характару.

Прыступлена да рамонту катла.

С. К—ў

У 1931 годзе поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць

Праект пастановы СНК БССР

Кожны пісьменны павінен навучыць няпісьменнага

Падрыхтоўчая камісія ўнесла ў СНК праект правядзеньня раду важных мерапрыемстваў па канчатковай ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослага працоўнага насельніцтва БССР.

Згодна праекту, усе няпісьменныя ад 12 да 45 гадоў у вёсцы і ад 12 да 50 гадоў у горадзе, непазбаўленыя выбарчых правоў, павінны зарэгістравацца да 1-га мая 1930 году ў мясцовых саветах.

Рабочыя, батракі і рабочыя саўгасаў і ўсе члены прафсаюзаў, дапрызыўнікі 1908, 1909 і 1910 гадоў нараджэньня, а таксама вайскоўцы, якія адбываюць вайсковую службу ў тэрытарыяльных часьцях, або невайсковым парадкам павінны ліквідаваць сваю няпісьменнасьць на працягу 1930 году, іншае працоўнае насельніцтва — у 1930-31 годзе.

Праектам прадбачыцца прыцягненьне да бясплатнае работы па ліквідацыі няпісьменнасьці ўсіх асоб ад 18 да 50 гадоў, якія не пазбаўлены выбарчых правоў і маюць веды ў аб'ёме курсаў ня менш сямігодкі ў гарадох і ня менш чатырохгодкі ў іншых мясцовасьцях.

Пералічаныя асобы, па даручэньні адпаведных органаў асьветы, на працягу 1930-31 году павінны навучыць пісьменнасьці 1-га няпісьменнага, або выканаць іншую работу ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці. У выпадку немагчымасьці, па важных прычынах, прымаць удзел у ліквідацыі няпісьменнасьці, гэты ўдзел можа быць заменены, паводле пастаноў адпаведных саветаў, аднаразовымі грашовымі ўзносамі ў разьмеры 5 проц. месячнага заработку за сябе, або ў разьмеры 2 з палов. проц. месячнага заработку за асобу, якая знаходзіцца на яго ўтрыманьні. Узносы плацяць толькі тыя асобы, якія атрымліваюць ня менш 100 руб. на месяц у акруговых гарадох, 75 руб. на месяц у іншых гарадох і 35 рублёў у іншых мясцовасьцях.

На асоб, якія ўхіляюцца ад рэгістрацыі, або ад ліквідацыі няпісьменнасьці, могуць накладацца штрафы да 25 руб.

Асобы, якія ўхіляюцца ад удзелу ў ліквідацыі няпісьменнасьці, або аплаты грашовага ўзносу, будуць аштрафаваны ў разьмеры да 50 руб., або прыцягвацца да прымусовых работ на тэрмін да аднаго месяца.

Усе пісьменныя ад 18 да 50 год, пазбаўленыя выбарчых правоў, замест непасрэднага ўдзелу ў ліквідацыі няпісьменнасьці, абкладаюцца спэцыяльным зборам.

Сродкі вытворчасьці кулакоў--калгасам

У Бабруйшчыне раскулачваньне зараз праводзіцца пры актыўным удзеле беднаты і сераднятства. У вёсках Рыва-Разьлевічы і Жуковічы, Глускага раёну, ліквідавана пяць кулацкіх гаспадарак, маемасьць якіх перадана калгасу.

З хутароў Валасовічы на пастанове сходу беднаты і калгаснікаў выселены кулакі, маемасьць іх перадана калгасу «Чырвоны Ўсход». У хаты кулакоў не расселены бедняки і калгаснікі.

У некаторых сельсаветах і раёнах усё-ж такі невыстарчальна разгорнута работа з беднатой. У Слуцкім раёне **быў выпадак, калі** пры раскулачваньні **быў** закрануты серадняк. Зараз гэта памылка выпраўлена.

АГРАПАХОД ЧАСЬЦЕЙ БВА

Стаўропальцы ў Лагойшчыне

Восьмая гадзіна раніцы... Дакладна бяз усялякага спазьненьня брыгады цесьляроў, кавалёў, рымараў, абожжавачышчальнікаў, рахункаводаў выстраіліся на Лагойскім пляцы. Начальнік штабу агрэпаходу дае загад: брыгада кавалёў у 17 чалавек працуе ў дзьвёх кузьнях; брыгада цесьляроў перабудоўвае пажарны хлеў у насенны склад калгасу «Бальшавік»; брыгада рымараў—рамантуе збрую таго-ж калгасу; рахункаводы—заводзяць справы і навучаюць, як весьці справаводзтва; абожжавачышчальнікі—чысьцяць насеньне; дактары (разам з дактарамі сутапарыскай арганізацыі) прымаюць у мясцовай больніцы хворых; ветэрынарныя дактары агляда юць зьвярэй. Рэшта чырвонаармейцаў ідзе малаціць збожжа перададнае калгасу «Лепшая Доля» пасьля раскулачваньня кулакоў.

Вось і вызначаны месцы работы. Дружна, на-таварыску ўзяліся за справу, з ахвотай, з энтузіязмам.

Ідзем да цесляроў. Вялікі пажарны хлеў. Навукова дошкі, абгаралыя бярвёны будынку Лагойскага сельсавету, які згарэў тыдзень назад, падпалены чыйёсьці завучынай рукой. Хутка сьцелецца малотак, рыхтуюцца дошкі і з абгорэлага матар'ялу стоўпкі для засекаў. Работа кіпіць.

...Кавалі, рымараны, з тым-жа энтузіязмам ладзяць дэмяны да цугоў, рамантуюць бораны і акучнікі.

Абожжавачышчальнікі—іх 55 чалавек—кідаюць 4 трыеры. Той-жа тэмп работы. Песня больш скардзіцца брыгадзіры—дзе трыеры ня былі гатовы.

12 гадзін, і мы ў калгасе «Лепшая Доля». Калгас арганізаваны 8 месяцаў таму назад. Адразу-ж кідаецца ў вочы пырокая будоўля: ўзорны (праўда, яшчэ ня скончаны) хлеў—сьвінарнік і вышка, дзе ідзе пракладка артэзіянскае студні.

Падыходзім да вышкі і далей, да хляна, дзе ідзе малацьба збожжа, таго збожжа, якое пяць дзён таму назад належала кулаку, а сёньня гаспадарамі гэтага збожжа зьяўляюцца калгаснікі. Кіпіць работа...

І гэтак цэлы дзень. Усяго толькі адзін дзень. І ў выніку:

Зроблена 12 новых лемяшоў, адраманавана 14 барон і 2 трыеры, падладжаны 3 акучнікі, падкаваны 13 коняй, акавана 13 саней, ачышчана 1.000 пудоў насеньня, пажарны хлеў перабудаваны ў насенны склад, зроблены 3 вадапойныя карыты, напраўлены кармушкі для жывёлы, абмалочана і ачышчана больш за 200 пудоў збожжа, агледжана 69 хворых, зроблена 8 вочных аперацый, адрамантавана калгасная вупраж.

І, нарэшце, арганізавана пяць новых калгасаў на вёсках: Рудня, Гасьцілавічы, Зазер'е, Сьвідна і Панізоўе.

А ў самым мястэчку Лагойску, па просьбе мясцовае ўлады і насельніцтва, зьнята статуя нейкага «сьвятога», якую да гэтага часу, ня гледзячы на пастановы вугальных сходаў, мясцовая ўлада не адважвалася зьняць. Статуя, перадана сельсавету для рэалізацыі.

Вось выпік агрэпаходу Стаўропальскага кавалер. палка.

А. Грышанаў.

ДОБРА ПРЫНЯЛІ КУРСАНТАЎ

Аб'яднаная Беларуская вайсковая школа прыбыла ў мястэчка Койданава. Яе сустралі працоўныя Койданава з аркестрам і з факеламі. У нардоме быў наладжаны лятучы мітынг, дзе выступалі з прывітаньнямі: прадстаўнік ад партыйнай і камсамольскай арганізацыі, ад райвыканкому, ад калгаснікаў, ад курсантаў, начальніцкага складу і чырвонаармейцаў выступаў начальнік школы тав. **Васілевіч.**

Байцы разышліся начаваць па хатах калгаснікаў. Радасна прынялі калгаснікі курсантаў. Зразу-ж пасыпаліся пытаньні, на якія хутка даваліся ясныя і зразумелыя адказы.

7-га лютага ўсе брыгады разьехаліся па вёсках: Макаўчыцы, Баравая, В. Цярлінка, Касіловічы, Воўкі, дзе і ўзяліся за работу.

За два дні шчырай, энэргічнай, рупнай работы курсантамі і брыгадамі было зроблена многа. Ветэрынарная брыгада чырвонаармейцаў аказала дапамогу 15-ці коням, 8 каровам, агледжаны 62 каровы ў калгасе і праведзена многа гутарак па жывёлагадоўлі. Раздана шмат літаратуры. Зроблена прышчэпка 30 сьвіням. Была арганізавана салітарная выстаўка ў вёсцы Макаўчыцах, якую наведала за дзень 150 сялян.

Значную працу прарабілі брыгады сярод жанчын і беднаты. У вёсцы Макаўчыцы недаволі растлумачана была мясцовымі арганізацыямі пікодзасьць кулака ў калгасах. Некаторыя згодны былі-б прыняць кулака. Былі гутаркі, што «ён такі чалавек, як і я, чаму яго ня прыняць у калгас?».

Брыгадам было па гэтым пытаньні дана тлумачэньне, што кулака трэба гнаць з калектыву, што асноўная задача ўсіх арганізацый — ліквідацыя кулацтва, як клясы.

ВАЙТОВІЧ.

У *Рагачэўска-Жлобінскім агракамбінаце*

На тэрыторыі вялікай будоўлі

Мы дагэтуль часта чыталі ў газэтах аб падрыхтоўцы да весьняе сяўбы ў асобных раёнах, у асобных калгасах. Але мы нічога ня ведалі аб тым, як праходзіць падрыхтоўчая работа ў такім буйнейшым калгасным аб'яднаньні, якім зьяўляецца Рагачэўска-Жлобінскі агракамбінат (100.000 гектар пашнай зямлі, 7.500 гаспадарак).

ПЕРАЛОМ НАСТУПІЎ

Тая няправільная і шкодная «ўстаноўка», якая была выкінута некаторымі калгасаўцамі, у тым ліку і Менскім—аб няматэрзгодзнасьці пладзьбітнага абгуленьня жывёлы ў новых калгасах—разьбіта дапчэнту жыцьцёвай практыкай Рагачэўска-Жлобінскага камбінату. Там зараз ідзе інтэнсіўнае абгуленьне жывёлы ня толькі буйной, але і дробнай (сьвіньні, авечкі), ня толькі ў вёсках, але і ў былых хутаровых гаспадарках (у адным Сталінскім сельсавеце кала 40 проц. усіх гаспадарак былі хутарскія).

Праўда, лічбы абгуленьня пакуль яшчэ ня зусім высокія, (кала 30 проц.), але тут трэба зрабіць паправку на агавокі. Лічбы абгуленьня мяняюцца вынікам работы за апошнія тры тыдні—калі наступіў пералом, калі калгаснікі разварушыліся і пачалася сапраўдная работа.

«ПАТУРБУЙЦЕСЯ АБАГУЛІЦЬ І ДРОВНУЮ ЖЫВЁЛУ»

Зараз абагуленьне ідзе шаркім тэмпам. Не пасьпешуць у калгаснікі абагуліць буйную жывёлу, як яе прыходзіць і заяўляе: «А вы патурбуйцеся ўжо абагуліць і дробную жывёлу—сьвіней, авечак». Людзі ня могуць адмовіцца з улікам і з запісам, настолькі, калі напор калгаснікаў.

А ў камбінаце не хапае жалезі. Няма рахунковых работнікаў—і гэта адмоўным чынам можа адазвацца на выніках абагуленьня. У некаторых зараз ны-пунктах камбінату

таньне аб рахункаводах стаіць ня менш востра, чым пытаньне з забесьпячэньнем агранамічным персаналам. Трэба неадкладна, зараз-жа накіраваць туды групу рахунковых работнікаў.

ЗА ЖЫВЁЛАЙ НАГЛЯДАЕ ГАСПАДАР ЧАЕ ВОКА

У былых хутарскіх гаспадарках абагуленая жывёла (па 20-30-50 галоў) разьмешчана ў спэцыяльна прыстасаваных да гэтага вялікіх хлявох, гумнах. Абсталяваны кармушкі, выразаны вокны, жывёла стаіць на прывязі, як быццам ужо цэлыя гады.

Для нагляду за жывёлай прызначаны спэцыяльна вылучаныя калгаснікі, якія пасуць адказнасьць за цэласьць і правільнае ўтрыманьне жывёлы.

Першымі па разьмеры абагуленьня ідуць сельсаветы Мяркулавіцкі і Гарадзецкі і апошнімі—Сьвяржанскі і Майскі.

БЫЛЫЯ ХУТАРАНЦЫ—ВЯЗБОЖНІКІ

Вось старшыня калгасу «Сялян. Інтэрнацыянал» (складаецца з 140 хутарскіх гаспадарак) т. **Дзямяненка**, з захапленьнем расказваючы аб гаспадарчых клопатах, заяўляе:

— А ў нас жывёла ўжо абагулена поўнасьцю на ўсе 100 проц. Мы цяпер чакаем распараджэньня з кусту—дзе нам будаваць, дзе нам ставіць пастаянныя абагуленыя хлявы.

— У нас і палітычна-культурная работа не пакінута—100 калгаснікаў ужо маюць у кішэні білеты членаў МОПР'у, арганізаваны куток бязбожнікаў.

ЁСЬЦЬ І НЕДАХОПЫ—ІХ ТРЭБА ПЕРАМАГЧЫ

Зразумела, ня ўсё так добра і гладка ідзе ў камбінаце. Ёсьць і адмоўныя бакі і некаторыя перашкоды, але пры некаторай энэргіі іх можна перамагчы.

Не капае цьвіку, затрымліваецца будаўніцтва, аб гэтым крычаць ва ўсіх органах. Слаба пакуль што разгортваецца будаўніцтва—і тут справа ня толькі ў недахваце будаўнічых матар'ялаў, але і ў адсутнасьці людзкіх кадраў, кіраўнікоў—члены праўленьня камбінату перагружаны і самі ня могуць справіцца з усімі задачамі.

У некаторых пунктах засыпка абагуленых насенных фондаў ня робіцца з прычыны адсутнасьці прыстасаваных сьвірнаў.

Ёсьць і адмоўныя моманты, якія трэба аднесьці за конт несьвядомасьці некаторай часткі саміх калгаснікаў.

ВА ЎСІХ КУТНОХ КІПІЦЬ РАБОТА

У раёне камбінату ва ўсіх кутках кіпіць работа. Калі вы станеце на перакрыжаваньні шляхоў, то ўбачыце, як роены бакі, у розныя пункты вязуць бароны і плугі, фурманкі і яшчэ розны інвэнтар, жывёлу і насеньне. Сустрэньня калгаснікі гавораць:

— Вось прышлеце фатографа, няхай здымае нашу работу, няхай яе ўбачаць і іншыя калгаснікі і заразіцца нашымі тэмпамі работы.

А калгасніца на разьвітаньне гаворыць:

— Мы ўступілі ў калгас—і гэта спраўда канчаткова вырашаная. Наша думка зараз—як-бы гаспадарку наладзіць і добра падрыхтавацца да вясны.

РАБОЧЫЯ-БРЫГАДЗІРЫ Ў КАМБІНАЦЕ

У заключэньне два словы аб рабочых брыгад—рагачэўскіх і жлобінскіх. Брыгадзіры працуюць з максымальнай энэргіяй, прымаюць рагачы ўдзел у сяўбе, у сроднай вытворчасьці. Калі мы за апошні час заўважаем пералом у настроях рабоце калгаснікаў, то ў гэтым мы шмат абавязаны энэргіі і самаадданасьці рабочых брыгад.

Л. Н.

Усебеларуская аргнарада ЦСПСБ

13-га лютага на заключным пасяджэньні усебеларускай аргнарады ЦСПСБ былі зацьверджаны рэзалюцыі, якія распрацоўваліся дэлегатамі нарады па сэкцыях.

РАБОТА ПРАФАРГАНІЗАЦЫЙ НА ВЁСЦЫ

Усю работу па ўдзеле прафарганізацый у пасеўнай кампаніі трэба перавесьці на рэйкі сапсаборніцтва, ужываючы мэтад прэміяваньня прадпрыемстваў, якія дасягнулі лепшых вынікаў у гэтай работе. Пасылка рабочых брыгад на вёску павінна насіць плянавы характар і ўзгадняцца з зацікаўленымі арганізацыямі. Прадпрыемствам трэба замацаваць пастаянную сувязь з пасланымі 500 рабочымі ў калгасы праз шэфства над калгасамі і раёнамі, дзе працуюць рабочыя-калгаснікі. Нарада выказалася за правядзеньне пасьля веснавой сяўбы акруговых канфэрэнцый рабочых-калгаснікаў для абмену практыкай іх работы.

Нарада пастанавіла, што члены саюзу, якія ўступаюць у калгасы і працуюць далей на вытворчасьці, захоўваюць сваё саюзнае членства, а рабочыя і служачыя, якія ўступілі ў калгас і парвалі сувязь з вытворчасьцю, захоўваюць саюзнае членства на працягу двух гадоў. Што датычыць батракоў-членаў саюзу, то яны, стаўшы членамі калгасу, саюзнага членства не пазбаўляюцца і ўступаюць у ячэйку сельгаспрацоўчых, якая арганізуецца ў буйным калгасе ці калгасным аб'яднаньні.

Нарада выказалася за перабудову шэфскай работы па практыцы рэарганізацыі яе на Менскай акрузе. Кожны вытворчы саюз бярэ шэфства над цэлым раёнам. Шэфтаварыствы арганізуюцца на больш буйных прадпрыемствах, а таксама ва ўстановах, над якімі шэфствуюць прадпрыемствы таго ці іншага вытворчага саюзу.

ПЕРАБУДОВА ПРАФАПАРАТУ

Нарада прапанавала закончыць перабудову прафапаратаў на працягу 10 дзён.

Пры ЦСПСБ, згодна новай структуры, арганізуецца 7 сэктароў: сэктар кадраў, арганізацыйна-інструктарскай работы, вытворчасьці і зарплаты, сацыяльна-бытавы і рабочага забесьпячэньня, культурнай работы, фінансава-адміністрацыйны і сэктар масавых кампаній.

Нарада прызнала свячасовым ліквідаваць акруговыя аддзяленьні ўсіх саюзаў, дапускаючы ў асобных выпадках вылучэньне акруговых упаўнаважаных ЦП саюзаў.

Пры фабзаўмясцкомах замест камісій вылучаюцца 4 арганізатары: па культурна-асьветнай рабоце, па кадрах, па вытворча-эканамічнай рабоце і сацыяльна-бытавой. Такія-ж арганізатары вылучаюцца і пры цэхавых камітэтах.

ПАДРЫХТОЎКА ПРАФСАЮЗНЫХ КАДРАЎ

Пасьля перавыбараў ФЗМК павінны быць арганізаваны для нанава выбраных работнікаў ФЗМК кароткатэрміновыя курсы на 320 чалавек. Акрамя таго, да 1-га верасьня павінны распачаць работу 6-месячныя школы на 1.000 чал. Школы камплектуюцца ў першую чаргу за лік рабочых-ударнікаў, асабліва тых, якія прымаюць актыўны ўдзел у прафработе, за лік работніц, моладзі і членаў ФЗМК.

На працягу 5 год нам патрэбна звыш 8.000 новых спэцыялістых

Рэарганізацыя сыстэмы кіраўніцтва прамысловасьці БССР патрабуе максымальнага насычэньня прамысловага апарату тэхнічнымі кадрамі.

Арганізацыя навукова-дасьледчай работы ў прамысловасьці БССР, адкрыцьцё навукова-дасьледчага інстытуту патрабуе шэўнага кадру спэцыялістых, без якіх вызначаны плян работы ня зможа быць ажыцьцёўлены.

На 1-га кастрычніка 1929 году ў прамысловасьці БССР працавала 695 спэцыялістых, з якіх 219 з вышэйшай асьветай, 476 — з сярэдняй. Сярэдні процант спэцыялістых да агульнай колькасьці рабочых складаў 0,33 з вышэйшай асьветай і 0,78 — з сярэдняй.

Зараз прэзыдыум ВСНГ распрацаваў пяцігодку патрэбнасьці прамысловасьці ў спэцыялістых. Згодна гэтай пяцігодкі, у 1929-30 г. патрэбна новых 1.035 спэцыялістых з вышэйшай асьветай і 1.965 з сярэдняй; у 1930-31 годзе—630 з вышэйшай асьветай і 1.265 — з сярэдняй; у 1931-32 годзе — 650 з вышэйшай і 1.410 — з сярэдняй і ў 1932-33 годзе—515 спэцыялістых з вышэйшай асьветай і 1.255 — з сярэдняй. Усяго за 4 гады будзе патрэбна 8.830 спэцыялістых, з якіх 2.870 з вышэйшай асьветай і 5.960 — з сярэдняй.

У гэтым лічбы не ўваходзяць спэцыялістых Лесбелу і аграспэцыялістых. Асобная вага спэцыялістых з вышэйшай асьветай узрасьце да канца пяцігодкі ад 0,33 да 1,7 проц., а з сярэдняй асьветай — ад 0,78 да 3,5 проц.

16-га ЛЮТАГА, а 7 гадзіне ўвечары (памяшканьне клюбу імя ЛЕНІНА—вул. Урыцкага)

адкрываецца

пленум савету і праўленьня Белаэзт

Камфракцыя там-жа а 5 гадзіне дня.

МЕНСК

У Мевску пачнецца пабудова магутнай радыё-станцыі

Савет Народных Камісараў пастанавіў пабудаваць у Менску магутную радыёстанцыю ў 40 клв., з паступовым павялічэньнем магутнасьці ня менш чым да 100 клв. Пабудова пачнецца ў бягучым годзе.

З пускам новай радыё-вяшчальнай станцыі існуючая станцыя будзе абслугоўваць толькі мясцовае насельніцтва.

Каштоўнасьці у фонд індустрыялізацыі

Увесь час у Дзяржбанк паступаюць каштоўныя рэчы ад працоўнага насельніцтва—золата, срэбра і пэрлы—у фонд індустрыялізацыі краю.

Побач з членамі ЖАКТ'аў (аб якіх мы пісалі раней) асаблівую актыўнасьць у зборы каштоўнасьцяй праявілі працаўнікі Белжылсаюзу, якія сабралі 778 грамаў золата, 19 кілё 160 гр. срэбра і на 10 руб. аблігацый дзяржпазык.

Працаўнікі камгасу здалі 72 кілё медзі і 6 кілё 82 гр. срэбра. Койданаўскі райком КП(б)Б здаў 350 грам золата.

Ад'езд рабочых брыгад

Рабочыя брыгады, вылучаныя прадпрыемствамі г. Менску для ўдзелу ў месячніку вышчаднасьці, выехалі ў акругі. У кожную акругу выехала па адной брыгадзе.

Брыгада маскоўскага электразаводу сёньня выязджае ў Гомель для праверкі ходу месячніка вышчаднасьці.

Чужому элемэнту—ня месца ў радах прафсаюзаў

Аргнарада пры ЦСПСБ, адзначаючы наяўнасьць некаторае засьмечанасьці радоў прафсаюзаў клясава-чужым элемэнтам, прапанавала ўсім прафарганізацыям выключаць з прафсаюзаў і звальняць з работы ўсіх былых жандараў, гапэйэнсіх, служкаў рэлігійных культаў, гандляроў, былых афіцэраў і контрразьведчыкаў белых армій, былых абшарнікаў і заводчыкаў, пазбаўленых праў, купакоў і іх агентаў.

Трэба выключыць з саюзу тых, хто займаецца шкодніцтвам, сыстэматычным хуліганствам, хто злосна падрывае працоўную дысцыпліну.

Аўтаматычна выключаюцца з членаў прафсаюзаў асобы, зьнятыя з вучоту біржы пры праверцы складу беспрацоўных, а таксама асобы, зьнятыя з работы ва ўстановах у парадку чыстки па першай катэгорыі.

Сацыялістычны дагавор бязбожнікаў

Гэтымі днямі дэлегацыя бязбожнікаў Заходняе вобласьці РСФСР заключыла дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва з бязбожнікамі БССР.

Уступіўшыя ў спаборніцтва арганізацыі паставілі перад сабой наступныя задачы: **павялічыць колькасьць членаў арганізацыі бязбожнікаў на 100 проц., галоўным чынам за кошт сацыялістычнага сэктару вёскі, палепшыць якасьць масавай работы, увязаць антырэлігійную работу з сацыялістычным будаўніцтвам.**

Абедзьве арганізацыі бязбожнікаў ставяць перад сабою мэту — **падрыхтаваць нізавы актыў бязбожнікаў у ліку тысячы чалавек** для масавай антырэлігійнай работы, павялічыць падпіску на антырэлігійную пэрыядычную літаратуру на беларускай мове і мовах нацменшасьцяй БССР і г. д.

Прафсаюзы—на дапамогу веснавой сяўбе

Сёньня ў калгасы Віцебшчыны, Аршаншчыны і Жлобіншчыны выязджаюць 3 БРЫГАДЫ РАБОЧЫХ, ЯКІХ ПАСЫЛАЕ БЕЛБЮРО ЦК ЧЫГУНАЧНІКАЎ. Брыгады атрымалі рад заданьняў па калектывізацыі і едуць на работу на 1 месяц.

***

Саюз дрэваапрацоўшчыкаў г. Менску прыняў шэфства над Заспаўскім раёнам для дапамогі і кіраўніцтва весьнавой кампаніяй. У раёне працуе ўжо 14 ударнікаў. Арганізаваны лекавыя габінэты, гурток бязбожнікаў (калгас «Чырвоны Прамень») і гурток першае дапамогі (калгас «КІМ»).

Наогул, прафарганізацыі дрэваапрацоўшчыкаў накіравалі на вёску 104 чал. Фізкультурнікі саюзу дрэваапрацоўшчыкаў таксама прымаюць актыўны ўдзел у правядзеньні пасеўнай кампаніі: робяць выезды ў падшэфныя калгасы з агітацыйнай мэтай, ставяць спэк таклі, арганізуюць гурткі фізычнае культуры.

ЗА ДЗЕНЬ

Наркамасьветы **дэтэрмінова выпусьціў 4-ы курс пэдтэхнікуму.** Менскі пэдтэхнікум скончыла 30 чалавек, Барысаўскі таксама 30. Усе скончыўшыя пэдтэхнікумы накіраваны на работу ў вясковыя школы.

***

Менскае т-ва «Прэч Няпісьменнасьць» пастанавіла арганізаваць **збор грошай** сярод ячэек т-ва «П. Н.», пунктаў ліквезу і школ малапісьменных **на трактарную калёну** для аднаго з калгасаў суцэльнае калектывізацыі.

***

Т-ва «П. Н.» пастанавіла прасіць Менаакрывашканком ад аддачы Кацярынінскай станова выклікана патрабаваньнямі вуцарквы пад клюб малапісьменных. Паназ пунктаў малапісьменных.

Стаўкі рахункаводаў у калгасах

Наркампрацы распрацаваў стаўкі для рахункоўных працаўнікоў, якія будуць пастаянна працаваць у калгасах.

Рахункаводы ў калгасах разьмерам у 500 гэктараў — атрымліваюць 60 руб. на месяц, да 1.000 гэктараў — 70 рублёў і звыш — 75 руб. Бухгальтары ў калгасах да 1.000 гэкт.—100 рублёў на месяц і звыш 1.000—120 руб. У калгасах звыш 3.000 гэкт. устанаўляецца пасада бухгальтароў з акладам у 150 руб.

Навіны МЦРК

Гэтымі днямі МЦРК пачынае адпускаць пайшчыкам па кніжках **гатовую вопратку,** выдача вопраткі па талёнах касуецца.

***

У магазыне МЦРК № 45 (Савецкая вул. супроць кіно «Чырвоная Зорка») пачынаюць выдаваць **мануфактуру па павышаных цэнах.**

***

МЦРК сумесна з Ваенведам адкрыў у АБВШ **чырвонаармейскую чайную.**

300 ясьляй у калгасах Меншчыны

Менскі аддзел аховы маці і дзіцяці (Ахматмлад) адкрывае сёлета 300 ясьляй у калгасах. Апрача таго будуць арганізаваны курсы ахматмладу, праз якія пройдзе 300 калгаснік.

Дом для спэцыялістых у Менску

Вясною ў Менску пачнецца пабудова буйнога дому-камуны на 150 кватэр для прыяжджаючых спэцыялістых. Кошт будаўніцтва — 550 тыс. руб. У гэтым-жа годзе пабудова дому будзе скончана.

Вымова за бязьдзейнасьць

Цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту пры ЦВК БССР абвясьціла вымову за бязьдзейнасьць магілеўскай акруговай камісіі садзейнасьці.

Менскай акруговай камісіі пастаўлена на від за слабое разгортваньне вярбоўкі новых укладчыкаў.

Як прайшоў у гэтым годзе прыём у ВНУ

На пасяджэньні СНК БССР Нарком Асьветы тав. **Платун** паведаміў аб выніках прыёму ў вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы ў 1929-30 г.

У вышэйшыя навучальныя ўстановы трэба было прыняць 1.200 чал. і ў сярэднія школы—6.500 чал. Прынята ж у ВНУ 1.118 чал., па сярэдніх навучальных установах норма прыёму цалкам выканана.

У гэтым годзе па ВНУ сялянская курыя выканана толькі на 55 проц. На мэфак трэба было прыняць 40 проц. беднякоў, батракоў і серадняковаў, прынята 24 проц., па праўгас замест 35 проц.—20 проц., на пэфак замест 65 проц.—55 проц. сялян. У Беларускай С.-Г. Акадэміі замест 60 проц беднякоў, батракоў і серадняковаў прынята толькі 38,7 проц. Сялянская курыя выканана поўнасьцю толькі па Гэтэрынарным інстытуце. Каб палепшыць саціяльны склад прыёму ў Беларускую С.-Г. Акадэмію, ужо пасьля прыёму была праведзена мабілізацыя рабочых.

У гэтым годзе падрыхтоўваюцца для паступленьня ў ВНУ 2.500 чал., а іх каля 400 калгаснікаў. Чырвоная армія прыхтуе 650 чал. Гэтымі днямі НКАсьветы атрымаў заяўку ад ЦК саюзу с.-г. рабочых на падрыхтоўку ў ВНУ 300 батракоў.

У новым навучальным годзе ў ВНУ будзе прынята каля 4.000 чал.

Рахунковыя працаўнікі Менску не адстануць

Агульна-гарадзкі сход рахунковых працаўнікоў гор. Менску 12 лютага прайшоў з вялікім уздымам. Заля клюбу была перапоўнена. Даклад тав. **Калмыка** аб задачах партыі на вёсны і ролі рахунковых працаўнікоў у калгасах быў заслуханы з напружанай увагай. У спрэчках па дакладу тав. **Глініна** аб ходзе вярбоўкі добраахвотнікаў у калгасы выказалася шмат прысутных. Матар'ял «Зьвязды» аб калектывах, якія адстаюць, і паасобных дэзэртырах з фронту калектывізацыі, цалкам пацьвердзіўся. Сход рэзка асудзіў паводзіны асобных рахункаводаў. Адзін з тых, што хістаюцца (бухгальтар Гармізэ—абутковая фабрыка), заявіў, што ён усьвядоміў сваю памылку і просіць неадкладна накіраваць яго ў калгас на сталую работу. Тут-жа на сходзе абвясьцілі сябе добраахвотнікам, **і яшчэ 9 асоб.**

Рахунковыя працаўнікі ўзялі на сябе абавязак не пазьней 15-га лютага выканаць плян дадатковай вярбоўкі і вылучыць са свайго асяродзішча лепшых таварышоў, якіх не хапае для выкананьня заданьня па Менскай акрузе.

Краснапёрка.

ГАРАДЗКАЯ НАРАДА РЭВІЗІЙНЫХ КАМІСІЙ

СЁНЬНЯ, 15-га лютага, а 7 гадз. увечары

ў памяшканьні АК МОПР'у

АДБУДЗЕЦЦА

гарадзкая нарада рэвізійных камісій ячэек МОПР'у

НА ПАВЕСТКЫ ДНЯ: аб месячніку адзінай рэвізіі.

Яўка абавязкова.)—(Мен. АК МОПР'у.

Нарадамленьні

17-га лютага, а 20 гадз., у Доме Камасьветы імя Карла Маркса (пакой № 19 увах. з вул. Энгельса) адбудзецца дыспут на тэму: «ТЭАРЫТЫЧНАЯ ВУЧОБА ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ». Уступная прамова загадчыка сэктару прапаганды ЦК КП(б)Б тав. ФЭЙГЭЛЬСОНА.

Увах. па запраш. білет., разасланых пэрсанальна таварышом, і па парт. білетах.

17-га лютага, а 19 гадз., у памяшканьні хэмічнага корпусу ВДУ адбудзе агульна-студэнцкі сход сумесна з навуковымі сіламі ВДУ і інжынэрна-тэхнічнымі работнікамі г. Менску.

Парадак дня: рэарганізацыя втузаў і задачы хэмфаку, паведамленьне прадст. ВСНГ і НКА аб пэрспэктывах разьвіцьця хэмічнае прамысловасьці і падрыхтоўкі кадраў, абвяшчэньне факультэту ўдарным.

На сход запрашаюцца прадстаўнікі ЦК, Мен АК і РК КП(б)Б, бюро парткалектываў, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, НКА, ВСНГ, Дзяржпляну, камітэту па хэмізацыі пры СНК, ЦП саюзу хэмікаў, праўленьня ВДУ, прадстаўнікі ўсіх дэканатаў і рабфакаў, выканбюро, М. В. і Т. С.

Прадстаўнікі газэт і ўсе інжынэрна-тэхнічныя сілы Менску.

Сёньня—нарада аб вучоце рабселькораўскіх допісаў

Сёньня, 15-га лютага г. г., а 1-й гадз. дня сэктарам друку Культпропу ЦК КП(б)Б (у памяшканьні ЦК КП(б)Б) склікаецца нарада па пытаньні аб рэарганізацыі сыстэмы вучоту рабселькораўскіх допісаў у газэтах Беларусі.

На нараду абавязаны зьявіцца адказныя прадстаўнікі ўсіх рэдакцый цэнтральных газэт, а таксама працаўнікі рэдакцый, якія непасрэдна ведаюць вучотам допісаў.

Запрашаюцца прадстаўнікі ЦСУ і і рэдкалегій шматціражак заводаў «Бальшавік» і швейнай фабрыкі «Акцябр».

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

Фрунзаўскі райком КП(б)Б вылучыў ніжэйпаіменаваных таварышоў прапагандыстыі ў адзіную райпартшколу і асобна арганізаваныя групы пры райпартшколе па ахапленьні партвучобай уступіўшых у партыю ў ленінскія дні 1930 г. і беспартыйнага актыву, які ня быў ахоплены партвучобай у першым навучальным паўгодзьдзі.

Якубчык — НКУС, Казуноў — ВАН, Смаргічкоў—Культаддзел ЦСПСБ, Лунец, Спэктар, Фарбэр, Ляскоўскі, Дубавіцкі і Фрыдман—СНК, Сухараў—рэд. «Рабочай», Доўнар—БАН, Грушэўскі—выстаўком, Мурашкевіч — ЦВК, Эфрон—фабрыка «Прагрэс», Башнеў, Лаўрусевіч і Карнячоў—завод «Камунар», Вітлін—Цэнтрвыдавецтва, Шміхаў—Палітэхнікум, Папоў—рэд. «Зьвязда», Шмідт—Саюз Паляўнічых, Вержбаловіч—рэд. «Зьвязды», Літвіновіч—Бумтрэст, Крывашэін — «Чырвоны Тэкстыльшчык», Круглін—НКПрацы, Акулін—дырэктар Велпэдтэхнікуму, Баранаў, Бераловіч, Вігдаровіч, Вайцэнка, Лук'янаў, Кулініенка, Аксёнаў, Аўсеенка і Турбовіч—Камвуз, Угараў—Лесбел, Шчупак—шпалерная фабрыка, Зуненшайн, Конар—завод «Беларусь», Бабянкоў, Друтман, Гутман, Шамэс, Кручэўскі, Карчык, Казімірчык, Ражноў, Курбака, Гвазьдзёў, Геўрасёў і Халепа—Камвуз.

Усе гэтыя таварышы павінны быць вызвалены ад усялякіх нагрузак у парт'ячэйках за выключэньнем наведваньня партсходаў, а таксама ад пасылкі ў камандыроўкі.

Дакладчыкамі ў яч. Фрунзаўскага раёну на тэму: «12-я гадавіна Чырвонае арміі» вылучаюцца наступныя т. т.:

Ад рэдакцыі газ. «Зьвязда»: Красьнеўскі ў яч. шпалерная фабрыкі, Мітлін—яч. хлебазаводу, Асьмоў—яч. друкарні «Зьвязда», Жабінскі — завод «Пралетары»; рэдакцыя «Рабочай» — Якаўлеў—фабрыка «Акцябр»; ВСНГБ—Грысевіч—фабрыка «Акцябр»; Камвуз—Саевіч—фабрыка «Акцябр»; ЦВК—Чарвякоў—яч. заводу «Камунар»; ад Камвузу: Лур'е—завод «Камунар», Гімэльфарб—завод «Камунар», Аўчыньнікаў — «Дрэваапрацоўшчык», Белашэўскі—зав. «Дрэваапрачоўшчык», Вайнштэйн—завод «Беларусь», Цывунчык—кандытэрская фабрыка, Ярмолін—галянтарэйная фабрыка, Данілчык—яч. цаг. зав. Гандальбуду (Тучынка, 9) і Тамашэвіч—яч. аддз. хлебазаводу ЦК КП(б)Б—Канакоцін—фабрыка «Прагрэс», Будзінскі—1-я друкарня. ВСНГБ—Васкабойнікаў—фабрыка «Чырвоны Тэкстыльшчык»; Белпэдтэхнікум—Акулік—Эльвод, «Чырвоная Зьмена»—Джэлюк—п.-к. «Палітграф»; ЦК МОПР'у—Калмык—рымарская фабрыка; НКА — Платун—Белдзяржбуд; рэд. «Орка» — Прынц—Белдзяржбуд; ад ЦСПСБ—Клімковіч—Белдзяржбуд, Рыжоў і Розінаў—Гандальбуд; Польпэдтэхнікум—Обэрфэльд—Гандальбуд; Акр. інспэктарыят асьветы—Ермакоў—каап. прадпрыемства харчавікоў; АПА АК—Радкевіч—каап. прадпрыемства харчавікоў, БАН—Бялуга—Вадаканал; Белдзяржплян—Мачульскі—саюз будаўнікоў, АК ЛКСМБ—Мітлінкі—двухгадовыя пэдкурсы, ЦСУ—Шастакоў—яч. п.-к. краўдоў; рэд. «Рабочай»—Розэнблюм—яч. міліцыі; Лесбел—Угараў—яч. міліцыі, ГЭТ—Алейнікаў—яч. ДЭТ; рэдакцыя «Акцябр»—Лунец—яч. Аўтакіраўніцтва; Наркамгандлю—Абрамсон—яч. аўтакіраўніцтва.

Яч. КП(б)Б умовіцца з дакладчыкамі і на працягу 18—22 лютага 1930 г. паставіць гэтыя даклады па ўсіх прадпрыемствах. Вылучаным-жа дакладчыкам 17-га лютага, а 7-й гадз. веч. зьявіцца ў клюб Дому Камасьветы (пакой № 19) на кансультацыю (калі дакл. мае ў гэтым патрэбу).

СЁНЬНЯ

БДУ. Арганізацыйны сход залічаных на курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і рабфакі—а 19 гадз., у памяшканьні анатамічнага інстытуту.

Дом Асьветы. Заняткі палітурсаў для асьветнікаў па цыклях: палітэканомія, гістарычн. матэрыялізм і рэвалюцыйны рух. Яўка ўсіх запісаных на курсы абавязкова. Пач. а 19 гадз.

Фрунз. РК. Канфэрэнцыя ўдарных брыгад, прызначаная на 15, пераносіцца на 20 лютага.

ЗБОР СРОДКАЎ НА ТРАКТАРНУЮ КАЛЁНУ

Згодна пастановы пашыранага пленуму Фрунзаўскага райкому КП(б)В, арганізуецца збор сродкаў на трактарную калёну імя Фрунзаўскай арганізацыі КП(б)Б. Усе паступаючыя на трактарную калёну сродкі павінны ўносіцца ў галоўн. ашчадн. касу, на бягучы рахунак № 01721 Фрунзаўскага РК КП(б)Б.

ЗАЎТРА

Нядзельн. рабочы унівэрсытэт. 16-га лютага пач. заняткі нядзельн. рабоч. унівэрсытэту ў Нова-Барысаве, а 12-й гадз. дня, у клюбе «Якас». Вядзецца прыём новых слухачоў.

Пасьлязаўтра

Дом Камасьветы. 17-га лютага, а 20 гадз. (пакой № 19), адбудзецца дыспут на тэму: «Формы, мэтады і зьмест вучобы парткалектыву». Увах. па білетах, разасланых аддз. культуры і прапаг., і па партбілетах.

Пэдгабінэт. Пасяджэньне сэкцыі палітэхніч. асьветы—а 19 гадз. Даклад тав. **Сагаловіча** на тэму: «Сувязь матэматыкі з вытворчасьцю, як адна з умоў палітэхнізму школы».

16-га лютага—адкрыты сход ячэйкі БДВ

16-га лютага, а 7-й гадз. увечары, у памяшканьні Дому Пісьменьнікаў (Савецкая, 68) адбудзецца чарговы адкрыты сход ячэйкі БДВ і рэдакцый газэт.

У парадку дня: 1) Даклад старшыні ЦСПСБ тав. І. П. РЫЖОВА аб адзінаначальні, 2) Інфармацыя аб падрыхтоўцы да па-за чарговай чысткі апарату БДВ і 3) Бягучыя справы.

БЮРО ЯЧЭЙКІ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ВЫШЛІ З ДРУКУ РЭЗАЛЮЦЫІ СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б.

З ДАДАТКАМІ: аб пазыцыі т. Чарвякова па пытаньнях барацьбы з правым ухілам і нацыянал-дэмакратызмам. Аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б. За няўхільнае выкананьне пастаноў пленуму ЦК КП(б)Б.

Стар. 94. Цана 15 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

Новы выдатны мастацкі фільм

У АГНІ НАРОДЖАНАЯ

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Субота, 15 лютага, для Дому Камасьветы імя Карла Маркса

ПРЭМ'ЕРА С. ГОДЫНЭР

ДЖЫМ КУПЕРКОЛ

у 4 акт. і 10 абразох.

Пастаноўшчык Л. М. Літвінаў.

Білеты ў Доме Камасьветы імя К. Маркса.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Мастацкі фільм **ТРАНСПАРТ АГНЮ**

— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —

Кіно-часопісь „Сав. Беларусь" № 2 Белдзяржкіно.

Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Пралетарыі

Нямецкі фільм вытворчасьці Уфа-фільм 1929 г.

3-ці тыдзень пастаноўкі

ВІНАВАТЫ (судовая памылка)

У галоўн. ролі БЭРНАРД ГЭТЦКЕ.

Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 гадз.

КІНО Пралетарыі

Нямецкі фільм **МЕРТВАЯ ПЯТЛЯ**

драма з цыркавога жыцьця ў 8 частках.

У галоўнай ролі ВЭРНЭР КРАУС І ЖЭКІ ЮГО.

Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса ад 5 г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"

Алімпіяда зімовага спорту ў 1928 г.

БЕЛЫ СТАДЫЁН

Звыш праграмы культурфільм

МАЛПА БАВІАН у 1 част.

Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.

Каса адчынена ад 12 гадз. дня.

КІНО СПАРТАК

Звыш праграмы гастролі сатырыка-гумарыстага **А. В. АГРАНОВІЧА** НА ЭКРАНЕ мастацкі баявік **МЕСЯЦ ЗЬЛЕВА** драма у 6 ч.

СЁНЬКЯ 4 СЭАНСЫ.

ПАЧАТАК 1-га сэансу—а 5 г. 30 м.
2-га „ —а 7 г. 15 м.
3-га „ —а 9 г.
4-га „ —а 10 г. 30 м.

КАСА—ад 4 г. 30 м.

Менск, Галоўлітбел № 337.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва

Вышлі з друку і паступілі ў продаж:

Бібліятэка калгасьніка

В. Мілюцін. Калгасы—асноўныя задачы калектыўных гаспадарак у сучасны пэрыяд. Стар. 40. Цана 8 кап.

П. Заяц.—Весьнавая сельска-гаспадарчая кампанія і яе задачы. Стар. 64. Цана 20 кап.

Г. Калесьнікава. — Сваімі сіламі—Камуна «Молат»—На ўсесаюзным конкурсе калгасаў атрымала 1-ю прэмію. Стар. 64. Цана 12 кап.

А. Цэлішчаў.—Як дзьве вёскі зрабіліся калгасам. Стар. 44. Цана 15 кап.

Сялянская бібліятэка

В. Авэрбух. — Хваробы рагатае скаціны. Стар. 56. Цана 20 кап.

Праф. А. Макарэўскі. — Сухоты свойскае жывёлы. Стар 24. Цана 10 кап.

ВЫШАЎ З ДРУКУ, ПАСТУПІЎ У ПРОДАЖ І РАЗАСЛАНЫ УСІМ ПАДПІСЧЫКАМ.

№ 2 „ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК" № 2

ОРГАН ЦК КП(б)Б.

ЗЬМЕСТ

Рэарганізацыя партыйнага апарату.
Рэзалюцыя ЦК УсеКП(б) аб рэарганізацыі апарату ЦК УсеКП(б).

АГІТАЦЫЯ І ПРАПАГАНДА.

ЦЫУНЧЫК.—Як ідзе завочная партвучоба актыву.
А. НЕКРАШЭВІЧ.—У паход за пралетарскую культуру.
АЗАРОНАК.—Камсамол і весьнавая сяўба.

НА АБГАВАРЭНЬНЕ.

О. КАНАКОЦІН.—Штабы палітычна - культурнага абслугоўваньня раёнаў суцэльнай калектывізацыі.
О. КАНАКОЦІН. М. ЛАБАДАЕЎ.—Перабудавацца бальшавіцкім тэмпам.

ПРАКТЫКА МЕСЦ.

БОЙКА.—Як выконваюцца дырэктывы партыі ў Прапойскім раёне.
ШПЭКТАРАЎ.—Як мы арганізавалі шэфства рабочых над Наркамгандлем.

БІБЛІЯГРАФІЯ.

Мэтад распрацоўкі рэзалюцый Студзеньскага Пленуму ЦК КП(б)Б.

Асобным дадаткам з гэтым нумарам «ПАРТЫЙНАГА РАБОТНІКА» рассылаюцца ўсім падпісчыкам „РЭЗАЛЮЦЫІ СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б".

Кожная хата-чытальня, кожны пардом, клюб, бібліятэка павінны выпісваць «ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК».

Кожны камуністы, камсамолец, кожная партыйная і камсамольская ячэйкі павінны выпісваць, чытаць і распаўсюджваць «ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК».

УМОВЫ ПАДПІСКІ

1 м-ц —25 кап.	6 м-цаў—1 р. 50 кап.
3 м-цы—75 кап.	На 1 год—2 р. 75 кап.

Кошт асобнага нумару 15 кап.

ПАДПІСКУ ПРЫМАЮЦЬ: галоўная кантора газэты „ЗЬВЯЗДА", Бюро падпіскі Белдзяржвыдавецтва і Дзяржвыдавецтва РСФСР і ўсе паштовыя аддзяленьні і лістаносцы.

Ад Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР

10-ты ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ ПА 1-Й ПАЗЫЦЫІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ народнае гаспадаркі СССР

адбудзецца 20—22 лютага 1930 г. на Днепрабудзе і ў г. Запарожжы.

У гэтым тыражы будзе разыграна 23.300 выйгрышаў на агульную суму 3.001.500 руб., у тым ліку:

1 выйгр.	25.000 р.	84 выйгр. па	1.000 р.
5 „ па	10.000 р.	3150 „ „	250 р.
10 „ „	5.000 р.	20050 „ „	100 р.

У гэтым тыражы бяруць удзел усе аблігацыі пазыкі, за выключэньнем тых, якія ўжо выйгралі ў ранейшых тыражох. Табліца выйгрышаў будзе друкавацца ў газэтах «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» і па мясцы тыражу.

КУПЛЯЕ ЛЕД

бровар „БЕЛАРУСЬ"

Менск, Старажоўская, 44.

— ДАВЕДКІ ТАМ-ЖА. —

14/I—30 г. у прысутнасьці грамадзян у Міхалкаўская царкве, Мазырскай акругі, я адмовіўся ад сану папа, заявіўшы, што парываю назаўсёды сувязь з царквой і рэлігіяй.

Мікола ДУБІЦКІ.

Займаўся рытуальнай рэзкай скаціны на Менскай гарадзкой разьніцы. Абвяшчаю, што адмаўляюся ад рэзкі жывёлы і хатніх птушак.

Р. Ш. САГАЛОВІЧ.

У працягу 20 год служыў рабінам Барысаўскай сынагогі. Абвяшчаю, што адмаўляюся ад абавязкаў рабіна, аб чым 26/XII—29 г. мною падана заява ў Барысаўскі гарсавет.

М. Х. РУДЭЛЬСОН.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

ПРАПУСКІ, выд. Белдзяржкіно за №№ 27 і 28 на імя рэдакцыі газ. «Зьвязда» на права ўваходу ў кіно—лічыць несапраўднымі.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты ад 2 гадзіны дня

Друкарня газэты «Зьвязда».